ШТУРМАВАЦЬ КОЖНЫ ГЭКТАР!

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выдання—XV
№ 272 (4178)
Аўторак, 6 кастрычніка 1931 г.
Выходзіць БЕСЬПЕРАПЫНКА.

МАКСЫМУМ СІЛ на неадкладнае ЗАВЯРШЭНЬНЕ СЯЎБЫ

УДЗЕСЯЦЯРЫЦЬ тэмпы ворыва ЗЯБІ

80 проц. трактараў і 30 проц. коняй--НА ЗЯБЛІВА

ЗАМАЦАВАЦЬ СПЭЦЫЯЛЬНЫЯ БРЫГАДЫ ПА ВОРЫВЕ

Ударнымі тэмпамі выканаць плян зяблівa

Зяблівае ворыва зьяўляецца важнейшым фактарам у барацьбе за падняцьце прадукцыйных сіл сельскай гаспадаркі. Надняцьце ўраджайнасьці, зьніжэньне працоўных затрат на палявых работах, гаспадарчае ўмацаваньне калгаснай вытворчасьці, падняцьцяе таварнасьці калгасаў — усё гэта ў вялікай ступені зьвязана з выкананьнем пляну зяблівa.

Як-жа абстаіць справа на гэтым, адным з важнейшых вучасткаў асеньняй с.-г. кампаніі?

Становішча з зяблівым ворывам вызначае самую сур'ёзную трывогу.

Паводле даных НКЗ, на 30-га верасьня плян зяблівага ворыва выкананы усяго толькі на 13,9 проц., пры чым апошняя пяцідзеўка дае самы мізэрны прырост — 3,2 проц. Гэтыя паказальнікі становяцца асабліва пагражаючымі, калі прыняць пад увагу, што тэрмін выкананьня пляну канчаецца 10-га кастрычніка.

Дзе-ж трэба шукаць тлумачэньняў падобнага роду ганебных прарываў?

Асноўнай прычынай зьяўляецца **наяўнасьць у радзе месц яўнай недаацэнкі гаспадарча - палітычнага значэньня зяблівa**, нежаданьне рашуча павесьці барацьбу з традыцыямі гаспадараньня на старыцы.

На самай справе, чым іншым, як ня простым ігнараваньнем дырэктыў партыі і ўраду можна вытлумачыць той факт, што ў радзе сельсаветаў, як напрыклад, у Кохапаўскім, Славінскім, Пручанскім, Новасельскім (Талачынскага раёну) Кабанаўскім, Радускім, Лукаўскім, Скляпнянскім, Пухавіцкім (Жлобінскага раёну), зяблівае ворыва яшчэ **зусім не пачыналася.**

Якія апраўданьні можна знайсьці таму, што ва многіх раёнах процант выкананьня пляну зяблівага ворыва **зусім нязначны?** Так, Бягомльскі раён на 30 верасьня выканаў плян на 0,6 процантаў, Бярэзінскі — на 1,8 проц., Уваравіцкі — на 1,6 проц., Рэчыцкі— на 1,9 проц., Крычаўскі—на 3,1 проц., Чавускі—на 3,8 проц. і г. д.

Посьпех зяблівага ворыва непарыўна зьвязаны **з ходам усёй с.-г. кампаніі**, з правільнай расстаноўкай сіл **на ўсіх** вучастках палявых работ. **Рабочыя пляны** прадугледжваючыя выразнае разьмеркаваньне ўсіх сродкаў і сіл зьяўляліся важнейшым зьвяном у барацьбе саўгасаў і калгасаў за баль шавіцкае вырашэньне задач асеньняй с.-г. кампаніі.

Між тым прарывы ў ходзе зяблівага ворыва яўна сьведчаць, што ва многіх выпадках гэтыя пляны ці зусім **адсутнічаюць**, ці складзены зусім нездавальняюча.

Выключна - важнае значэньне мае пытаньне поўнай мабілізацыі і максымальнага скарыстаньня **ЦЯГАВАЙ СІЛЫ.** Аднак і ў гэтым пытаньні ў пераважнай частцы раёнаў маюцца буйнейшыя недахопы, якія моцна б'юць па зяблівым ворыве.

Пастанова НКЗ і Калгасцэнтру аб перакідцы на зяблівa ня менш 80 процантаў трактараў і 30 проц. конскай сілы вельмі часта ня выконваецца.

Асабліва недапушчальнымі гэтыя факты зьяўляюцца тады, калі трактары і коні ня маюць поўнай нагрузкі. Матар'ялы з месц, што сёньня друкуюцца намі, гавораць аб наяўнасьці дзе-нідзе недапушчальных і злачынных адносін да скарыстаньня цягавай сілы, аб фактах поўнага ігнараваньня ворыва зяблівa.

У Гарадоцкім раёне, напрыклад, калгасныя коні цэлымі табунамі ходзяць па полі, трактары ня маюць поўнай нагрузкі, а з зяблівам—прарыў. Аналёгічныя факты ёсьць і ў Рагачоўскім і іншых раёнах.

Такім зьявішчам трэба безадкладна і самым рашучым чыпам пакласьці канец, канкрэтных вінаватых у зрыве зяблівa — прыцягваць да адказнасьці.

Аднэй з прычын недапушчальнага адставаньня з зяблівым ворывам зьяўляецца наяўнасьць праваапартуністычнага нявер'я ў рэальнасьць пляну, разважаньні аб немагчымасьці іх выкананьня.

Так на гэты шлях стала праўленьне калгасу «Маладая гвардыя» (Рагачоўшчына). Нажаль, такія факты далёка не адзінкавы. Замест баявой работы па поўным выкарыстаньні цягавай сілы, па правільнай арганізацыі працы, па ліквідацыі абязьлічкі, па ўкараненьні зьдзельшчыны, разгортваньні ўдарніцтва — апартуністычныя элемэнты займаюцца перапевамі аб нерэальнасьці пляну і сваёй бязьдзейнасьцю зрываюць зяблівa. З гэтымі настроямі трэба бязьлітасна змагацца, брацъ іх у штыхі.

Тое становішча з зяблівым ворывам, якое ёсьць зараз, далей нецярпіма. Тут павінен быць забясьпечаны карэнны пералом **у самыя бліжэйшыя дні.**

Для гэтага перш за ўсё неабходна рашуча **пакончыць з недаацэнкай гаспадарча - палітычнага значэньня зяблівa, павесьці барацьбу з разважаньнямі аб нерэальнасьці пляну.**

Партарганізацыі абавязаны забясьпечыць зяблівую кампанію **штодзённым, апэрацыйным, канкрэтным кіраўніцтвам**, на хаду выправіць наяўныя недахопы.

Нечакаючы ніводнага дня перакінуць 80 проц. трактараў і 30 проц. конскай сілы на зяблівa, там дзе яшчэ сяўба ня скончана! Там дзе пасеўныя пляны выкананы, уся цягавая сіла павінна быць пастаўлена на зяблівa ў **максымальнай** колькасьці!

Стварыць **пастаянныя брыгады**, якія-б працавалі па зяблівым ворыве **да скончэньня работы.**

Зьдзельшчыну — на кожны вучастак, у кожную брыгаду!

Ніводнага абязьлічанага капя і трактара!

Разгарнуць шырокую **растлумачальна - масавую работу** вакол значэньня зяблівага ворыва сярод бядняцка-серадняцкіх **аднаасобных мас.**

Арганізаваць **сацспаборніцтва** з канкрэтнымі штодзённымі абавязацельствамі ў кожнай брыгадзе, сярод усіх трактарыстаў.

Камуністы, камсамольцы, ячэйкі — у рады ударнікаў зяблівa!

Зяблівае ворыва — ключ да перамогі чарговай веснавой сяўбы! Гэтым ключом мы павінны аўладаць і аўладаем! Мільён шэсьцьсот сямдзесят тысяч гэктараў пад зяблівa будзе ўзаравана!

ЗВОДКА НКЗБ

аб ходзе сяўбы азімых і зяблівa па раёнах БССР і па саўгасах на 30 верасьня 1931 г.

НАЗВА РАЁНУ	Пасеяна азімых (у проц. да пляну)	Узарана на зяб. (у проц. да пляну)	НАЗВА РАЁНУ	Пасеяна азімых (у проц. да пляну)	Узарана на зяб. (у проц. да пляну)
Брагінскі	70,7	10,2	Крупскі	104,3	8,5
Буда-Кашалеўскі	62,1	5,2	Капыльскі	81,7	38,8
Бабруйскі	99,4	22,8	Касьцюковіцкі	81,4	5,6
Веткаўскі	72,9	5,5	Клічаўскі	75,1	11,8
Глускі	72,1	34,0	Койданаўскі	59,4	17,1
Гомельскі	65,8	23,6	Крычаўскі	86,6	3,1
Жыткавіцкі	57,6	31,6	Лагойскі	75,6	8,6
Жлобінскі	81,7	6,3	Магілеўскі	81,4	15,2
Кармянскі	80,2	5,7	Мсьціслаўскі	98,3	14,1
Камарынскі	74,9	4,0	Менскі	80,9	28,3
Ельскі	55,7	5,9	Пранойскі	83,6	10,2
Лоеўскі	61,1	22,8	Пухавіцкі	63,0	9,6
Любаньскі	69,9	40,6	Плешчаніцкі	64,0	4,5
Лельчыцкі	70,3	—	Смалявіцкі	88,6	17,0
Мазырскі	79,4	25,9	Талочынскі	82,6	6,0
Нараўлянскі	56,7	7,4	Чэрвеньскі	98,8	16,5
Парыцкі	93,5	10,7	Чавускі	88,5	3,8
Пятрыкоўскі	68,8	56,2	Чэрыкаўскі	79,8	13,8
Рагачоўскі	96,0	3,4	Шклоўскі	99,6	18,2
Рэчыцкі	63,8	1,9	Вузьдзенскі	82,5	24,4
Слуцкі	88,7	19,2	Асьвейскі	95,8	25,2
Старобінскі	79,8	15,1	Аршанскі	100,4	24,7
Стара-Дароскі	62,8	16,6	Бешанковіцкі	102,8	—
Тураўскі	45,3	16,9	Віцебскі	84,7	5,3
Церахаўскі	101,9	8,7	Вушацкі	101,0	14,6
Чачэрскі	99,7	29,7	Гарадоцкі	106,7	16,1
Чырвонапольскі	95,5	9,2	Дубровенскі	87,3	9,2
Чырвона-Слабодзкі	85,8	29,0	Дрысенскі	89,2	11,4
Уваравіцкі	32,9	1,6	Лёзьнянскі	100,6	13,8
Хойніцкі	93,9	41,2	Лепельскі	88,7	12,3
Асіповіцкі	77,1	5,7	Полацкі	85,7	6,5
Быхаўскі	85,1	14,8	Расонскі	100,5	11,8
Барысаўскі	76,1	12,3	Сураскі	86,0	34,7
Бялыніцкі	100,0	13,3	Сеньненскі	76,0	3,3
Бярэзінскі	87,5	1,8	Сіроцінскі	96,2	17,9
Бягомльскі	80,6	0,6	Чашніцкі	84,4	3,8
Горацкі	101,3	3,5			
Заслаўскі	80,8	23,0	Па БССР	83,7	13,9
Клімавіцкі	84,8	15,3	Па саўгасах	78,0	11,3

4 сельсаветы не пачыналі ворыва зябі

ТАЛОЧЫН. Зяблівa, як адно з важнейшых мерапрыемстваў у барацьбе за павышэньне ўраджайнасьці, раённымі арганізацыямі яўна недаацэньваецца і стаіць пад пагрозай зрыву. На 30 верасьня плян выканан усяго на **6%. Кохапаўскі, Славінскі, Пручанскі і Новасельскі** сельсаветы яшчэ не пачыналі зяблівa.

Парт'ячэйкі, сельсаветы і праўлен калгасаў павінны па-бальшавіцку ўц ца за ліквідацыю прарыву, за вы наньне пляну зяблівa. Трэба неадк на арганізаваць пастаянныя брыга якія павінны працаваць па зяблівае поўнага выкананьня пляну.

Ул. К

Чарапашымі тэмпамі

Ліквідаваўшы прарыў у асеньняй сяўбе, пасьля сыпалаў **«Зьвязды», Вушацкая МТС** не пераключылася па зяблівае ворыва і ўзяцьце цалінных зямель.

На 23 верасьня МТС выканала плян зяблівa толькі на 25 проц. У гэты самы час трактары МТС скарыстоўваюцца нерацыянальна, ня маюць поўнай нагрузкі. Кіраўніцтва МТС мала зьвяртае ўвагі на работу асобных вытворчых частках. **Сацспаборніцтва і ўдарніцтва паміж вучасткамі** і асобнымі трактарстамі **не разгорнута.**

Партыйная ячэйка і кіраўніцтва М павінны такімі-ж тэмпамі пераключ да на зяблівае ворыва, як пераключ ся на асеньнюю сяўбу і скончыць зя ва ў тэрмін.

Ліпаўка Я

Зяблівa у небясьпецы

ЖЛОБІН. (Наш кар.). Пяць сельсаветаў раёну: **Кабанаўскі, Радускі, Лукаўскі, Скляпнянскі і Пірэвіцкі** адкладваюць зяблівa і яшчэ яго не распачалі. Таксама не распачалі зяблівa калгасы **Камірауўскага** сельсавету і саўгас **«Пірэвічы».**

Парт'ячэйкі і сельсаветы дагэтуль не зварачаюць увагі на пасьняховае правядзеньне важнейшай гаспадарча-палітычнай задачы — зяблівa.

МАШНІЦКІ.

12,3 проц.

ЛЕПЕЛЬ. На гледзячы на катэгар ныя пастановы дырэктыўных орга у Лепельскім раёне да гэтага часу перакінута 80 проц. трактараў і 30 п конскай цягавай сілы на зяблівае по га. У выніку ігнараваньня гэтых рэктыў плян зяблівa выканан усяго 12,3 проц. Рад калгасаў, лічя абслу вваюцца МТС яшчэ не пачыналі зяб

А. Садоўск

Выгнаць кулацкіх агентаў з калгасаў

РАГАЧОЎ. (Наш кар.). Сяўба азімых у калгасах **«ПЕРАМОЖЦА» (Гадзіловіцкі** сельсавет) і імя **ЧЫРВОНАЙ АРМІІ (Паболаўскі** сельсавет) праходзіць недапушчальна марудна.

У калгасе **«Пераможца»**, ня гледзячы на дапамогу саўгасу **«Турск»** (які ўзараў больш 40 гэкт.), плян сяўбы на 25 верасьня выканан толькі на 50 проц. Акрамя таго ў гэтым калгасе пяўбрана 5 гэкт. сенажаці, з якіх 2 гэкт. скошана і сена гніе. Да сіласаваньня **«Пераможца»** не прыступіў.

Калгас імя **Чырвонай арміі** засеяў 50 гэкт. у той час, калі трэба засеяць 112 гэкт. азімага кліну. Таксама ў гэтым калгасе ня ўбрала 16 гэкт. сенажаці, 12 гэкт. грэчкі, 10 гэкт. насеннай канюшыны. Сіласаваньне выкапана толькі **на 25 проц.**

Усе гэтыя прарывы тлумачацца тым, што зьдзельшчына ў гэтых калгасах ня стала асноўным вагаром у барацьбе за выкананьне гаспадарча-палітычных кампаній. Праўленьні гэтых калгасаў паапартуністычнаму адносяцца да выкананьня дырэктыў партыі і ўраду і нічога ня робяць у справе мабілізацыі калгасьнікаў на пасьняховае заш шэньне сяўбы.

У калгасе **«Пераможца»** пралезьлі лакі і заможнікі, якія самі ня вы дзяць на работу і вядуць разлагаю работу сярод калгасьнікаў. Яны гр раць: **«ранней убярэм сваё, а потым гаснае».** У калгасе знаходзіцца **Енісе ка**, бацька якога раскулачан. Праўле не калгасу ня прымае ніякіх мер ачысткі калгасаў ад варожых элемэн

Трэба з усёй сілай ударыць па бр дзейнасьці праўленьняў і вызнач калгасаў кулацкія элемэнты.

І. САЛАДУХІН

Зяблівa зрывaецца

РАГАЧОЎ. (Наш кар.). У калгасе **«Маладая гвардыя»** (Прыборскі сельсавет), дзякуючы бязьдзейнасьці праўленьня калгасу, нерацыянальнай расстаноўцы наяўных сіл, злачынна зацягваецца сяўба азімых. На пляне калгас павінен засеяць 100 гэктараў. На 30 верасьня засеяна ўсяго 40 гэктараў.

Праўленьне калгасу замест мабілізацыі калгасьнікаў на поўнае выкананьне пляну сяўбы а[illegible]ных, дэмабілізуе іх, разважаючы, што плян не рэальны. Праўленьне разважае, як: «яшчэ засеем 30-35 гэктараў і хопіць».

Таксама ганебнае становішча з уздымам зябі. Ня гледзячы на тое, што ў калгасе штодзённа гуляе 15-20 коняй да ўздыму зябі калгас не прыступаў.

Райкалгассаюзу і Мяркуловіцкай ячэйцы КП(б)Б трэба прыняць рашучыя захады, ударыць па апартуністах, якія разважаюць аб нерэальнасьці пляну і дамагчыся поўнага яго выкананьня.

Саладухін.

У Рагачоўшчыне з зяблівам не сьпяшаюцца

РАГАЧОЎ. Паводле пляну ў раёне патрэбна ўзяць 26.000 гэкт. зяблівa. Але сучасныя тэмпы **не гарантуюць** выкананьня пляну ў тэрмін.

Рад калгасаў і **ня думалі** пачынаць зяблівa. Напрыклад, калгас імя **Сьвердлова**, ня гледзячы на тое, што ўвесну 1932 г. яму патрэбна засеяць ня менш 400 гэкт. правых, яшчэ не распачаў зяблівa.

Неабходна абвясьціць рашучую барацьбу недаацэнцы зяблівa. Плян павінен быць выканан свайчасова.

Я. САВІЦКІ.

Табуны коняй гуляюць на полі

ГАРАДОК. Ворыва зябі па **Гарадоцкім** раёне пад пагрозай зрыву. На пляне ў раёне трэба ўзяць 38.000 гэкт. зябі. На 30 верасьня ўзята ўсяго 16,1 проц. заданьня.

Такія ганебныя тэмпы ворыва зябі тлумачацца тым, што да гэтага часу ня выканана пастанова Наркамзему аб пераключэньні 30 проц. конскай цягавай сілы і 80 проц. трактарнай на зяблівa. Амаль ва ўсіх калгасах **конская цягавая сіла не выкарыстоўваецца**, а замест гэтага коні табунамі ходзяць па полі.

Райкалгассаюз і райза павінны зьвярнуць асаблівую ўвагу на ўздым зябі і асаблівa цалінных зямель. Да 10 кастрычніка плян павінен быць выканан.

Зайцаў.

Заданьне партыі выканана!

БССР НАКІРАВАЛА У ДАПАМОГУ ГАРНЯКАМ ДАНБАСУ 9035 ЧАЛАВЕК

Да 10 кастрычніка скончыць адпраўку рабочых-будаўнікоў

З бальшавіцкім напорам выканаем і перавыканаем заданьне партыі і ўраду ва ўсіх яго дэталях

ЦО УсеКП(б) „Правда", ЦК КП(б)Б, СНК БССР, ЦО КП(б)Б „Зьвязда", „Савецкай Беларусі", НКП СССР, ЦСПСБ

Рапарт Цэнтральнай Камісіі садзейнасьці вярбоўцы рабочых для Данбасу

ШЫРОКАЕ РАЗГОРТВАНЬНЕ ВУГАЛЬНАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ, АДКРЫЦЬЦЕ НОВЫХ ДЗЕСЯТКАЎ КАПАЛЕНЬ ПАТРАБУЕ ЗНАЧНАГА ПАПОЎНЕНЬНЯ РАДОЎ ГАРНЯКОЎ ДАНБАСУ — БАРАЦЬБІТОЎ ЗА ХУТЧЭЙШАЕ ВЫКАНАНЬНЕ ВУГАЛЬНАЙ ПЯЦІГОДКІ.

ПАВОДЛЕ ЗАДАНЬНЯ ПАРТЫІ І ЎРАДУ БССР ТРЭБА БЫЛО НАКІРАВАЦЬ У ДАНБАС ДА 1-ГА КАСТРЫЧНІКА 9.000 РАБОЧЫХ.

ДЗЯКУЮЧЫ БАЛЬШАВІЦКАЙ РАБОЦЕ ЦЭНТРАЛЬНЫХ І МЯСЦОВЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ, ПАД КІРАЎНІЦТВАМ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ, ГЭТА ЗАДАНЬНЕ ВЫКАНАНА. ДА 5-ГА КАСТРЫЧНІКА З БССР У ДАНБАС НАКІРАВАНА ЗАМЕСТ 9.000 — 9.035 РАБОЧЫХ. У ТЫМ ЛІКУ: ГАРНЯКОЎ — 5.973 ЗАМЕСТ 5.000, БУДАЎНІКОЎ ДЛЯ ТРЭСТУ «ДАНБАСЖЫЛБУД» — 1.306 ЗАМЕСТ 1.560 І ДЛЯ ТРЭСТУ «УКРЖЫЛБУД» 1.756 ЗАМЕСТ 2.500.

АГУЛЬНАЯ КАНТРОЛЬНАЯ ЛІЧБА ВЫКАНАНА І ПЕРАВЫКАНАНА, АЛЕ ПА ВЯРБОЎЦЫ РАБОЧЫХ-БУДАЎНІКОЎ ЗАДАНЬНЕ ЯШЧЭ НЯ ВЫКАНАНА. ГЭТА ТЛУМАЧЫЦЦА ТЫМ, ШТО НЕКАТОРЫЯ РАЁННЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ НЕВЫСТАРЧАЛЬНА УЯВІЛІ САБЕ ВЯЛІЗАРНУЮ ГАСПАДАРЧА-ПАЛІТЫЧНУЮ ВАЖНАСЬЦЬ ГЭТАЙ СПРАВЫ І АПАРТУНІСТЫЧНА АДНОСЯЦЦА ДА ЯЕ ПРАВЯДЗЕНЬНЯ.

РАЗАМ З ТЫМ РАД РАЁНАЎ ПАКАЗАЎ САПРАЎДЫ БАЛЬШАВІЦКІЯ ТЭМПЫ РАБОТЫ І ДАТЭРМІНОВА ВЫКАНАЎ І ПЕРАВЫКАНАЎ ВЫЗНАЧАНЫЯ ДЛЯ ІХ КАНТРОЛЬНЫЯ ЛІЧБЫ, ЗА ШТО ПРЭМІЯВАНЫ ЦЭНТРАЛЬНАЙ КАМІСІЯЙ.

НЯ СУПАКОЙВАЮЧЫСЯ НА ДАСЯГНУТЫХ ПОСЬПЕХАХ, ЦЭНТРАЛЬНАЯ КАМІСІЯ САДЗЕЙНАСЬЦІ ЛІЧЫЦЬ НЕАБХОДНЫМ ПРАЦЯГВАЦЬ УПАРТУЮ РАБОТУ ПА ВЯРБОЎЦЫ БУДАЎНІКОЎ У АДСТАЮЧЫХ РАЁНАХ З ТЫМ, КАБ НЕ ПАЗЬНЕЙ 10-ГА КАСТРЫЧНІКА ПОЎНАСЬЦЮ ВЫКАНАЦЬ ВЫЗНАЧАНУЮ КАНТРОЛЬНУЮ ЛІЧБУ.

Старшыня камісіі ПУШЧЫН.
Упаўнаважаны аб'яднаньня «Вугаль» СОКАЛАЎ.

Н. Ра[illegible] гаваньнях.

Клімавіцкі і Рагачоўскі раёны прэміяваны

УЧОРА АДБЫЛАСЯ НАРАДА ЦЭНТРАЛЬНАЙ КАМІСІІ САДЗЕЙНАСЬЦІ ВЯРБОЎЦЫ РАБОЧЫХ ДЛЯ ДАНБАСУ. КАМІСІЯ СА ЗДАВАЛЬНЬНЕМ ВЫСЛУХАЛА ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ АБ ЮЛЬКАСНЫМ ВЫКАНАНЬНІ ЗАДАНЬНЯ ПАРТЫІ І ЎРАДУ. АДНАК, У ВЯРБОЎЦЫ РАБОЧЫХ-БУДАЎНІКОЎ ЗАДАНЬНЕ ВЫКАНАНА НА ДАНБАСЖЫЛБУДУ ТОЛЬКІ НА 87 ПРОЦ. І ПА УКРЖЫЛБУДУ — НА 70 ПРОЦ. РАБОТНІКІ З МЕСЦ АДЗНАЧАЛІ, ШТО КАНТРОЛЬНЫЯ ЛІЧБЫ ДЛЯ УСІХ РАЁНАЎ ЗУСІМ РЭАЛЬНЫЯ. АЛЕ ЧАСТКА РАЁННЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ НЯ ЦІКАВІЛАСЯ ГЭТАЙ СПРАВАЙ.

ЦЭНТРАЛЬНАЯ КАМІСІЯ, ПАДАГУЛЬВАЮЧЫ ВЫНІКІ КАМПАНІІ, АДЗНАЧЫЛА ВЯЛІЗАРНУЮ РОЛЮ, ЯКУЮ АДЫГРАЎ ДРУК, АСАБЛІВА ЦО КП(б)Б — ГАЗЭТА «ЗЬВЯЗДА».

ЗА СВАЯЧАСОВАЕ ВЫКАНАНЬНЕ ЗАДАНЬНЯ ЦЭНТРАЛЬНАЯ КАМІСІЯ ПРЭМІЯВАЛА: **КЛІМАВІЦКІ** РАЁН НА СУМУ 750 РУБ. І **РАГАЧОЎСКІ** — НА 500 РУБ.

ДЛЯ АЗНАЙМЛЕНЬНЯ З УМОВАМІ РАБОТЫ ЗАВЕРБАВАНЫХ РАБОЧЫХ, КАМІСІЯ ЎНЕСЛА ПРАПАНОВУ АБ НАСЬЛІЦЫ У ДАНБАС ДЭЛЕГАЦЫІ З ПРАДСТАЎНІКОЎ НАРКАМПРАЦЫ, ЦСПСБ, ЦК КАМСАМОЛУ, ДРУКУ, КАЛГАСЦЭНТРУ І ДВУХ КАЛГАСЬНІКАЎ З КЛІМАВІЦКАГА І КАСЬЦЮКОВІЦКАГА РАЁНАЎ.

Героі бальшавіцкіх тэмпаў будуць прэміяваны

Па ўсіх швэйных фабрыках БССР заараз праводзіцца выпучэньне лепшых ударнікаў—герояў сацыялістычнай працы гароды. Белшвэйаб'яднаньне вызначыла грашовы прэміяльны фонд у суме 30.000 руб. Па прыблізных падліках на фабрыках будзе выпучана для прэміяваньня капя 70 рабочых-ударнікаў спэцыялістаў і гаспадарнікаў.

Тэмпы швэйнікаў— усёй прамысловасьці БССР!

Разгортваньне вышэйшых форм сацспаборніцтва, поўнае практычнае ажыцьцяўленьне ўказаньняў тав. Сталіна—неабходная ўмова для далейшых перамог

Прывітаньне ад прэзыдыуму ЦСПСБ

ДА ЎСІХ РАБОЧЫХ, РАБОТНІЦ, АДМІНІСТРАЦЫЙНА - ТЭХНІЧНАГА ПЭРСАНАЛУ, ДА ЎСІХ ПАРТЫЙНЫХ, КАМСАМОЛЬСКІХ І ПРАФСЫЯНАЛЬНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ ШВЭЙНАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ БССР.

ЦЭНТРАЛЬНЫ САВЕТ ПРАФСАЮЗАЎ БССР ШЧЫРА ВІТАЕ ПЕРАМОЖЦАЎ НА ФРОНЦЕ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА ПРАДАЎНІЦТВА—РАБОЧЫХ І КІРАЎНІЦТВА ШВЭЙНАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ, ЯКІЯ СВАІМ ЭНТУЗІЯЗМАМ І ГЕРАІЧНАЙ РАБОТАЙ ДАБІЛІСЯ ВЯЛІЗАРНЕЙШЫХ ПОСЬПЕХАЎ--СКОНЧЫЎШЫ ПЯЦІГОДКУ ЗА 3 ГАДЫ.

ГЭТА ПЕРАМОГА ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА ЯШЧЭ АДНЫМ ДОВАДАМ ТАГО, ШТО, РАБОЧАЯ КЛЯСА, ЗГУРТАВАНАЯ ВАКОЛ ЛЕНІНСКАЙ ПАРТЫІ, НА ЧАЛЕ З ЦЭНТРАЛЬЦЫМ КАМІТЭТАМ, ПЕРАМАГАЮЧЫ ЎСЕ ТРУДНАСЬЦІ НАШАГА БУРНАГА РОСТУ, ЗЬНІШЧАЮЧЫ І АПРАКІДВАЮЧЫ ПЕРАШКОДЫ КЛЯСАВАГА ВОРАГА І ЯГО ПАДГАЛОСКАЎ—ПРАВЫХ І «ЛЕВЫХ» АПАРТУНІСТАЎ—ЗДОЛЬНА ДАГНАЦЬ І ПЕРАГНАЦЬ У ТЭХНІКА—ЭКАНАМІЧНЫХ АДНОСІНАХ ПЕРАДАВЫЯ КАПІТАЛІСТЫЧНЫЯ КРАІНЫ, ЗДОЛЬНА Ў МАКСЫМАЛЬНА КАРОТКІ ГІСТАРЫЧНЫ ТЭРМІН ПАБУДАВАЦЬ САЦЫЯЛІЗМ.

ВІТАЮЧЫ ВАС ПЕРАДАВІКОЎ І ПЕРАМОЖЦАЎ ЦЭНТРАЛЬНЫ САВЕТ ПРАФСАЮЗАЎ ПАТРАБУЕ АД ЎСІХ ПРАФСАЮЗНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ ШВЭЙНАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ ЯШЧЭ БОЛЬШ МАБІЛІЗАВАЦЬ АКТЫЎНАСЬЦЬ ЎСІХ РАБОЧЫХ НА АСНОВЕ ДАСЯГНУТЫХ ПОСЬПЕХАЎ ДЛЯ ДАЛЕЙШЫХ БАЛЬШАВІЦКІХ ТЭМПАЎ, АСАБЛІВА Ў ГАЛІНЕ ЯКАСЬЦІ ПРАДУКЦЫІ, РАЗГОРТВАЮЧЫ ВЫШЭЙШЫЯ ФОРМЫ САЦСПАБОРНІЦТВА (ГАСПАДАРЧА-РАЗРАХУНКОВЫЯ БРЫГАДЫ, СУСТРЭЧНА-ЗЬМЕННАЕ ПЛЯНАВАНЬНЕ), ПРАКТЫЧНА АЖЫЦЦЯЎЛЯЮЧЫ ЎКАЗАНЬНІ ТАВ. СТАЛІНА АБ ПОЎНАЙ ЛІКВІДАЦЫІ АБЯЗЬЛІЧКІ, УРАЎНІЛАЎКІ І АБ ПАЛЯПШЭНЬНІ САЦЫЯЛЬНА-БЫТАВОГА І КУЛЬТУРНАГА АБСЛУГОЎВАНЬНЯ РАБОЧЫХ МАС.

РАБОЧЫЯ ЎСЕЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ БССР, РАЎНЯЮЦЦЯ ПА РАБОЧЫХ ШВЭЙНАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ, ПЕРАНОСЬЦЬЕ ВОПЫТ ІХ РАБОТЫ НА СВАЕ ПРАДПРЫЕМСТВЫ.

ШЧЫЛЬНЕЙ РАДЫ ВАКОЛ ЛЕНІНСКАЙ ПАРТЫІ, ВЫШЭЙ БАЛЬШАВІЦКІЯ ТЭМПЫ, ДА НОВЫХ ПЕРАМОГ!

ПРЭЗЫДЫУМ ЦСПСБ.

Прывітальная тэлеграма тав. Сталіну

У сувязі з выкананьнем пяцігодкі за тры гады, Белшвэйаб'яднаньне і ЦП саюзу швэйнікаў адправілі прывітальныя тэлеграмы генэральнаму сакратару ЦК УсеКП(б) тав. СТАЛІНУ, СТАРШЫНІ ЦВК САЮЗУ ТАВ. КАЛІНІНУ, СТАРШЫНІ СНК САЮЗУ ТАВ. МОЛАТАВУ, ЦО УсеКП(б) «ПРАВДЕ», СТАРШЫНІ ВСНГ СССР ТАВ. АРДЖАНІКІДЗЭ, УсеЦСПС—ТАВ. ШВЭРНІКУ, газэтам «ЗА ИНДУСТРИАЛИЗАЦИЮ», «ТРУД» і органу Заходняга абкому УсеКП(б) «РАБОЧИЙ ПУТЬ».

Таксама паслана прывітаньні падшэфным чырвонаармейскім часьцам.

Урачысты пленум ЦП саюзу швэйнікаў

15 кастрычніка адбудзецца пашыраны пленум ЦП саюзу швэйнікаў БССР з удзелам гаспадарнікаў і рабочых-ударнікаў.

Пленум абмяркуе наступныя пытаньні: \аб выкананьні пяцігодкі швэйнай прамысловасьці ў тры гады і плян работы швэйнай прамысловасьці БССР на чацьверты квартал г.г. і 1932 году.

Для ўдзелу ў работах пленуму запрошаны прадстаўнікі ЦК саюзу швэйнікаў, гапоўнага камітэту дзяржшвэйпрамысловасьці РСФСР і УССР, «Ленінградодежды», Масквашвэю і пэрсанальна т.т. КАРП і ЧЫГУНОЎ.

РАЗГАРНУЦЬ УЗМОЦНЕНУЮ РАБОТУ ПА АРГАНІЗАЦЫЙНА-ГАСПАДАРЧЫМ УМАЦАВАНЬНІ КАЛГАСАЎ (ЦК УсеКП

Разьмеркаваньнем даходаў па працаднёх—

узьнімем прадукцыйнасьць працы ў калгасах

У ЧЫРВОНА-СЛАБОДЗІМ, БУДА-КАШАЛЕЎСКІМ І ТАЛОЧЫНСКІМ РАЁНАХ НЕ ВЯДУЦЬ РАШУЧАЙ БАРАЦЬБЫ З ПАРУШЭНЬНЯМІ ДЫРЭКТЫЎ ПАРТЫІ І УРАДУ

Да „Дня ўраджаю і калектывізацыі" скласьці пляны разьмеркаваньня даходаў ва ўсіх калгасах, абварыць іх на шырокіх сходах калгасных мас, і прыступіць да выдачы першай паловы даходаў

Канчаткова дабіць дробна-буржуазную ўраўнілаўку

Паводле пастановы НКЗ і Калгасцэнтру БССР ад 15 кастрычніка трэба разьмеркаваць сярод калгасьнікаў 50-75 проц. даходаў, якія ім належаць адпаведна выпрацаванай колькасьці працадзён.

Вопыт паказаў, што ў тых калгасах, дзе выдаюцца авансы выключна па працаднёх, сярод калгасьнікаў узьнімаецца працоўная дысцыпліна, памяншаюцца выпадкі навыхаўлаў на работу, павышаецца прадукцыйнасьць працы і тым самым гаспадарча ўмацоўваюцца калгасы. Вось чаму кампаніі сваячасовага і правільнага разьмеркаваньня даходаў партыя надае вялізарнае палітычнае значэньне.

Аднак, яшчэ далёка ня ўсе раёны зразумелі тую ролю, якую адыгрывае разьмеркаваньне даходаў у справе павышэньня якасных паказальнікаў калгаснай вытворчасьці. І якраз там, дзе існуе апартуністычная недаацэнка гэтага пытаньня, дзе пастанова Калгасцэнтру не даведзена да мас, дзе не наладжан улік працы — ёсьць больш усяго грубых парушэньняў сацыялістычных прынцыпаў разьмеркаваньня.

**Так, у калгасе «ЧЫРВОНАЯ СЛАБАДА», які знаходзіцца пад бокам раённых устаноў, члены праўленьня прадуктамі і грашыма сябе забясьпечылі, а аб тых калгасніках, якія на працягу ўсяго году па-ўдарнаму працавалі, зусім забыліся. Праўленцы атрымалі прадуктамі на 120-150 руб., плюс па 90 руб. грашыма, а УДАРНІКІ —

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

УСЕ СІЛЫ ТРАНСПАРТНЫХ ПАРТАРГАНІЗАЦЫЙ— на пасьпяховае правядзеньне асеньня-зімовых перавозак

АРШАНСКІ РАЙКОМ КП(б)Б ПАЧАЎ АГЛЯД СТАНОВІШЧА ПАРТРАБОТЫ НА ЧЫГУНАЧНЫМ ВУЗЬЛЕ

НІЗАВЫЯ ПАРТЫЙНЫЯ ЗЬВЕНЬНІ—ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ КАНКРЭТНЫМ АПЭРАЦЫЙНЫМ КІРАЎНІЦТВАМ

За высокую якасьць работы нізавога партыйнага зьвяна на транспарце

Чыгуначны транспарт уступіў у адказнейшы пэрыяд сваёй работы — асеньня-зімовыя перавозкі. Іх пасьпяховае правядзеньне залежыць ад таго, наколькі транспартныя партыйныя арганізацыі павярнуліся тварам да выкананьня гэтай адказнейшай задачы, наколькі яны перабудавалі сваю работу, наколькі яна перанесена ў нізавое вытворчае зьвяно.

Цэлы рад чыгуначных парткалектываў за апошні пэрыяд дабіліся значных посьпехаў у справе практычнай рэалізацыі дырэктыў партыі аб рэканструкцыі транспарту, аб змаганьні за магутную паравозную гаспадарку. Як на канкрэтны прыклад, мы можам паказаць на партыйныя арганізацыі Аршанскага і Магілеўскага вузлоў. Аднак, на гэтых посьпехах ні ў якім разе нельга спыніцца. Партыйныя арганізацыі павінны яшчэ з большай настойлівасьцю і энэргіяй перабудоўваць сваю работу, пераносячы цэнтр цяжару яе ў нізавое вытворчае зьвяно, мно жыць узорныя прыклады работы, якія дабыты ў радзе нізавых зьвеньняў чыгуначных партарганізацый.

Задача партыйных калектываў заключаецца ў тым, каб на аснове перабудовы сваёй работы дабіцца поўнай рэалізацыі прамовы тав. Сталіна, дабіцца поўнага правядзеньня спаранай язды, ліквідацыі абязьлічкі і ўраўнілаўкі.

Аршанскі райком партыі з учарайшага дня пачаў праверку становішча партработы на чыгуначным вузле. Гэты прыклад Аршанскай партарганізацыі павінен быць памножаны. Тыя партарганізацыі, якія абслугоўваюць чыгуначны транспарт, па прыкладзе аршанскай павінны ўсебакова праверыць стан работы чыгуначных парт'ячэек, парткалектываў, асаблівую ўвагу аддаўшы пагыбленьню зьместу работы нізавога партыйнага зьвяна.

Рабочыя партарганізацыі павінны яшчэ больш увагі аддаць кіраўніцтву партарганізацыямі чыгункі, дабіваючыся канкрэтызацыі і апэрацыйнасьці ў гэтым кіраўніцтве з тым, каб з посьпехам выканаць плян асеньня-зімовых перавозак.

Праводзім дэкаднік праверкі партработы на транспарце

Аршанскі райком КП(б)Б абвясьціў з 5 па 15 кастрычніка дэкаднік праверкі работы партыйнай і камсамольскай арганізацыі чыгуначнага вузла.

Мэта дэкадніка—выявіць наколькі партыйны і камсамольскі калектывы чыгункі спраўляюцца з выкананьнем дырэктыў партыі аб перабудове работы на транспарце. Замацаваць спаравую язду, поўнасьцю ліквідаваць абязьлічку, перавесьці ўсе зьвеньні транспарту на гаспадарчы разрахунак —вось асноўная задача дэкадніка. Разам з гэтым перад дэкаднікам стаіць задача—выявіць лепшыя нізавыя партыйныя і камсамольскія ячэйкі, ударнікаў камуністаў і камсамольцаў з тым, каб перанесьці вопыт іх работы на астатнія нізавыя партыйныя і камсамольскія зьвеньні.

Для правядзеньня дэкадніка ў райкоме партыі створана пяцёрка з прадстаўнікоў РК КП(б)Б, райкому камсамолу, парткалектыву чыгункі і прадстаўніка раённай газэты «Ленінскі прыклад». Апрача таго, арганізавана брыгада з ліку 20 членаў партыі і камсамольцаў, якія павінны ўсебакова праверыць работу партыйнай і камсамольскай арганізацый вузла.

Аршанскі райком КП(б)Б выклікаў на спаборніцтва Віцебскі, Гомельскі, Жлобінскі і Менскі райкомы партыі па лепшым правядзеньні такіх-жа дэкадникаў. Ініцыятыву Аршанскага раёну неабходна памножыць.

Гэта праверка дасьць магчымасьць ліквідаваць тыя буйныя недахопы, якія маюць месца ў рабоце чыгуначнага транспарту БССР. Асаблівая ўвага рабоце па правядзеньні праверкі павінна быць аддана нізавым чыгуначным друкам. Пасьценгазэты кожнага цэху, дэпо, майстэрні, а таксама раённая газэта на працягу праверкі павінны штодзённа асьвятляць ход праверкі, бязьлітасна выкрываць недахопы ў рабоце партыйных калектываў і нізавых партыйных зьвеньняў, усебакова папулярызаваць лепшыя прыклады ўзорнай работы паасобных цэх'ячэек і калектываў і гэтым самым дапаматчы партыйнай арганізацыі мабілізаваць чыгуначнікаў на барацьбу за бесьперабойную работу транспарту, своячасовае выкананьне пляну асеньня-зімовых перавозак.

Н. Г.

ЗА САЦЫЯЛІСТЫЧНУЮ РЭКАНСТРУКЦЫЮ камунальнай гаспадаркі

За апошнія тры-чатыры гады на аснове вялізарных посьпехаў у галіне прамысловасьці, партыя і савецкая ўлада сур'ёзна рушылі наперад аднаўленьне гарадзкой гаспадаркі.

У радзе гарадоў БССР пабудаваны новыя водаправодныя сеткі, трамвайныя лініі, вялікія рабочыя пасёлкі і г. д. Жыльлёвая плошча гарадоў павялічылася на 752.000 кв. мэтраў.

Посьпехі ў галіне аднаўленьня камунальнай гаспадаркі значна палепшылі матар'яльна-бытавыя ўмовы рабочых, узьнялася сацыяльна-культурнае абслугоўваньне працоўных мас. Аднак, гэтыя посьпехі ня могуць яшчэ задаволіць нарастаючых запатрабаваньняў працоўнага насельніцтва. Бурны рост сацыялістычнай прамысловасьці, рост культурнага ўзроўню рабочай клясы, прад'яўляюць усё большыя і большыя патрабаваньні да гарадзкой гаспадаркі.

Адсутнасьць патрэбнага водаснабжаньня адмоўна ўплывае на ўмовы жыцьця рабочых, дрэнная работа трамваю выклікае спазьненьні на фабрыкі і заводы, што ў сваю чаргу адбіваецца на выкананьні прамфінпляну. Усё больш і больш адчуваецца разрыў паміж тэмпамі росту прамысловасьці, насельніцтва і росту гарадзкой гаспадаркі. Ва ўсю шырыню паўстала праблема рэканструкцыі камунальнай гаспадаркі, пляновага вядзеньня яе, шырокай электрыфікацыі і цёплафікацыі гарадоў, пабудовы новых водаправодаў, трамвайных ліній, культурна-бытавых устаноў.

«Посьпехі, дасягнутыя партыяй і рабочай клясай у барацьбе за індустрыялізацыю краіны і калектывізацыю сельскай гаспадаркі, стварылі ўсе неабходныя ўмовы для рашучага палепшэньня гарадзкой гаспадаркі—гэтай важнейшай базы перабудовы быту мільённых мас працоўных на новых сацыялістычных пачатках» (з рэзалюцыі чэрвеньскага пленуму ЦК УсеКП(б).

На аснове дырэктыў ленінскага ЦК, адпаведныя арганізацыі БССР прыступілі да разгортваньня найшырэйшага камунальнага будаўніцтва. У радзе гарадоў будуюцца новыя водаправодныя сеткі, механізаваныя лазьні-пральні, рабочыя пасёлкі, тэатры (Віцебск, Бабруйск, Магілеў, Гомель). У булучым годзе павінна пачацца будаўніцтва каналізацыі ў Гомелі і водаправоду ў Крычаве, Барысаве і Рэчыцы.

У сталіцы БССР — Менску, будуюцца аўтаматычная тэлефонная станцыя, водаправодная станцыя, цёпла-электрацэнтраль, палац кнігі, Дом Урэду, фабрыка-кухня і новыя дамы на сотні кватэр. Аднак, тэмпы гэтага будаўніцтва сьведчаць аб тым, што пытаньні рэканструкцыі камунальнай гаспадаркі яшчэ ня сталі ў цэнтр увагі партыйных, савецкіх, прафэсыянальных і грамадзкіх арганізацый. Будаўніцтва зацягваецца. Пабудовы дрэнна забясьпечваюцца матар'ялам. Заказы на абсталяваньне для камунальных прадпрыемстваў ня выконваюцца ў тэрмін і г. д.

5.700 кіпёваг, якія выпрацоўвае МЕНСКАЯ ЭЛЕКТРАСТАНЦЫЯ, не хапае для задавальненьня патрэб прамысловасьці і насельніцтва. Прадпрыемствы пашыраюцца, у строй уводзяцца новыя цэхі, якія патрабуюць значнай колькасьці электраэнэргіі. Выхад адзін — пабудова цёпла-электрацэнтралі, якая павінна весьціся ў звышударным парадку. Між тым, будаўніцтва амаль не пачыналася. Энэргацэнтр ня ўключыў пабудову ў сваю сыстэму. Заказы на абсталяваньне яшчэ ня зданы.

Пабудова не ўкамплектавана інжынэрна-тэхнічным персаналам. Ёсьць пагроза, што будаўніцтва ня будзе скончана ў вызначаны тэрмін.

Менскі водаправод устараў і не спраўляецца з задачай забесьпячэньня вадой прамысловасьці, будаўніцтва і працоўнага насельніцтва. Пачалася пабудова новай водаправоднай станцыі ў Навінках. Аднак, з-за выключна дрэннага забесьпячэньня матар'ялам будаўніцтва ідзе чарапашымі тэмпамі.

Менбуд зусім нядбайна аднесься да будаўніцтва АЎТАМАТЫЧНАЙ ТЭЛЕФОННАЙ СТАНЦЫІ. У будаўніцтве дапушчан рад адступленьняў ад праекту. Менскі гарсавет чамусьці не дапускае правядзеньня падземных работ. Прыбыла толькі палова патрэбнага станцыі абсталяваньня.

Гарсавет не аддае належнай увагі будаўніцтву фабрыкі-кухні, новай лазьні і мэханізаванай пральні, надзвычай патрэбных гораду.

15 кастрычніка павінна быць скончана будаўніцтва цёплаэлектрацэнтралі пры магілеўскай фабрыцы штучнага валакна. З-за перабояў у дастаўцы будаўнічых матар'ялаў пабудова зацягваецца. Магілеўскі гарсавет мала ўвагі аддае камунальнаму будаўніцтву. У мінулым годзе пачата пабудова 65-кватэрнага дому. Будаўніцтва павінна быць скончана да 1-га верасьня, фактычна яно ня будзе скончана ў гэтым годзе.

Пастанова СНК ад 10 верасьня аб рэканструкцыі камунальнай гаспадаркі БССР павінна легчы ў аснову работы ўсіх нашых арганізацый.

Б.

Асеньня-зімовыя перавозкі

ЛЕПШЫ ПАДАРУНАК ДА XIV ГАДАВІНЫ КАСТРЫЧНІКА—

ВЫКАНАНЬНЕ ВЫМЯРАЛЬНІКАЎ АСЕНЬНЯ-ЗІМОВЫХ ПЕРАВОЗАК

У ГОМЕЛЬСКІХ ДЭПО ГАСПАДАРЧЫ РАЗРАХУНАК ПРАВОДЗІЦЦА ТОЛЬКІ НА ПАПЕРЫ

Брыгада «Палескай Праўды», якая абсьледавала работу Гомельскіх дэпо, выявіла рад сур'ёзных вытворчых непаладкаў.

Паказаньні тав. Сталіна яшчэ не апанцілі належнага адлюстраваньня ў рабоце дэпо. Элементы ўраўнілаўкі і абязьлічкі не ліквідаваны.

Фактычна ніякага гаспадарчага разрахунку ў дэпо няма. Усе матэрыяльныя рэсурсы і пастаноўы па гэтым пытаньні амаль засталіся на паперы. Яшчэ горш станавішча на паравозах. Там па вводках усё як-быццам добра, а між тым паравозьлікі ня ведаюць ні перавагі, якія дае ім гаспадарчы разрахунак, ні ўмоў, у якіх яго трэба праводзіць.

Абязьлічка ў вагонным парку ўсё яшчэ не ліквідавана. Станозінча, пры якім ніхто не адказвае за вагон, прывяло да таго, што станцыя Жлобін і Унеча пачалі накіроўваць у Гомель сапсаваныя вагоны. Паказаньня станцыі праяўляюць поўную незацікаўленасьць у адрамантаваньні вагонаў і спадзяюцца, што гэты рамонт зробіць вагоннае дэпо Гомелю. У сувязі з гэтым Гомельскае дэпо -сартовачнае сыстэматычна перавыдаткоўвае ўстаноўленыя нормы рамонту па бюджэце.

Дэпо-сартовачнае дабілася некаторых дасягненьняў у галіне арганізацыі працы. У выніку разбуйненьня брыгад значна ўзьнята прадукцыйнасьць працы.

Да разбуйненьня сярэдні прыработак брыгад складаў 10 проц. Пасьля разбуйненьня брыгада з 4 асоб мае прыработку 140 проц., брыгада з 19 асоб—39 проц. Такое-ж становішча на таварным і пасажырскім парках. Там да разбуйненьня брыгады ў сярэднім мелі 37 проц. прыработку, а цяпер кавальская брыгада мае 127 проц. прыработку, дахаўшчыкі—142 проц., сталяры—149 проц., прыбіральшчыцы—40 проц., тормазная брыгада—63 проц.

Гэтых дасягненьняў дэпо-сартовачнае дабілася ў выніку перабудовы некаторых галін работы па-новаму.

Партыйныя і прафэсыянальныя арганізацыі дэпо павінны па-ўдарнаму ўзяцца за ліквідацыю ўсіх недахопаў у выкананьні транфінпляну. Да XIV гадавіны Кастрычніка дэпо павінна прысьці з выкананымі вымяральнікамі па асеньня-зімовых перавозках.

Дыспэтчарскі апарат працуе нявыразна

200.000 руб. страт за несвячасовую падачу паражняка

ЖЛОБІН. Рухомы склад у Жлобіне выкарыстоўваецца нерацыянальна з-за бязьдзейнасьці старэйшага дыспэтчара Мануліна. Апошні больш займаецца канцылярскай работай, чым кіраўніцтвам руху. У выніку—за несвячасовую падачу пад пляновыя перавозкі вагонаў, Лесбел прад'явіў рахунак на ўплату няўстойкі ў разьмеры 20.000 рублёў. Трэба ўзмацніць работнікамі дыспэтчарскі апарат Жлобінскага раёну.

№ 6494.

Цягнікі адпраўляюцца не па раскладу

Станцыі Магілеў і Ворша вельмі часта сваёй нявыразнай работай зрываюць планы с-та экспляатацыйнага раёну.

За першую дэкаду верасьня з агульнай колькасьці цягнікоў, якія адпраўлены са станцыі Магілеў на Віцебск, па раскладу было накіравана ня больш 40 проц. У другой дэкадзе верасьня гэты процант яшчэ больш зьніжаны. Гэта-ж самае і на станцыі Ворша.

Апрача таго, станцыя Магілеў ня выконвае даганору аб своячасовай адпраўцы тавараў, якія хутка псуюцца, з угодненымі цягнікамі. Тысячы вагонаў такіх грузаў не прымаюцца да адведзеных цягнікоў.

Такім чынам нявыразнасьць у рабоце станцый Магілеў і Ворша, самым адмоўным чынам адбіваецца на рабоце ст. Віцебск і інш.

Мясцовыя арганізацыі павінны зьвярнуць самую сур'ёзную ўвагу на работу станцый Магілеў і Ворша, улічваючы надыходзячыя грузапатокі.

Н. Н.

ЗВОДКА

аб выкананьні вымяральнікаў на чыгунках БССР за другую дэкаду верасьня

	Жлобінскі раён	Гомельскі раён	Аршанскі раён	Віцебскі раён
Сярэдня-сутачны прабег пасаж. паравозу				
Задана	225 клм.	290	250	240
Выканана	227	270	254,8	301,3
Проц. выкан.	100,8	93,1	119,2	121,3
Сярэдня-сутачны прабег тавар. паравозу				
Задана	186 клм.	191	188	199
Выканана	144,2	207	172,7	159
Проц. выкан.	77,47	108,4	91,85	80,3
Сярэдня-сутачны прабег тавар. вагону				
Задана	128,7	127,05	77,	240
Выканана	117,5	171,82	70,70	209
Проц. выкан.	91,3	135,2	98,3	85
Проц. хворых паравозаў,				
Задана	14,54	21,2	13,0	18,0
Выкан.	11,46	17,3	14,3	22,5
Сярэдня-суточная нагрузка				
Проц. выкан.	92,8	61,5	88	103
Проц. прасьледаваньня цягнікоў па раскладу.				
Таварных выкан.	80,2	93,4	67	58,6
Пасажырскіх выкан.	—	86	79,2	65,5

175.000 тон бульбы—Ленінграду

Два эшалёны з бульбай адпраўляюць Ленінграду камсамольцы Магілеўшчыны

Ініцыятыву магілеўскага камсамолу павінны падхапіць усе арганізацыі ЛКСМБ

КАМСАМОЛЬСКІЯ ЭШАЛЁНЫ З БУЛЬБАЙ

МАГІЛЕЎ, 4. (Белта). Камсамольская арганізацыя Магілеўшчыны абвясьціла сябе мабілізаванай на выкананьне пляну адгрузкі бульбы Ленінграду, Камсамол абавязаўся, шляхам арганізацыі суботнікаў па копцы бульбы, адгрузіць Ленінграду сваімі сіламі два камсамольскіх эшалёны з бульбай.

Усяго камсамольцамі будзе адпрацавана на ўборцы бульбы 2.000 чалавекадзён. Першы эшалён з бульбай вызначана адправіць у Ленінград 8 кастрычніка, другі—15 кастрычніка.

Бюро Магілеўскага РК ЛКСМБ прапанавала ўсім ячэйкам камсамолу неадкладна ўключыцца ў падрыхтоўку эшалёнаў з бульбай.

На чыгунцы арганізуюцца спэцыяльныя дзяжурствы камсамольцаў на ўвесь час адгрузкі. Ва ўдарным парадку рыхтуюцца сродкі для перавозак бульбы.

60 фурманак за ўвесь час замест 2000 кожны дзень

ВУШАЧЫ. (Наш кар.). Уборка бульбы ў Вушацкім раёне ідзе шырока разгорнутымі тэмпамі, а загатоўчыя арганізацыі нічога не зробілі для арганізацыі адгрузкі бульбы пралетарскім цэнтрам.

Раён павінен адгрузіць каля 3.000 тон бульбы.

Бульба вязецца на станцыю Лепель, адкуль накіроўваецца ў Ленінград. Для своячасовага выкананьня пляну адгрузкі трэба, каб кожны дзень на працягу месяца на станцыю Лепель адпраўлялася па 2.000 фурманак. Гэты плян зусім рэальны і можа быць поўнасьцю выкананы. Трэба толькі мабілізаваць вакол гэтай кампаніі ўвагу шырокіх мас працоўнай грамадзкасьці. Між тым за ўвесь час вывезена на ст. Лепель толькі 60 фурманак з бульбай. Гэта—вынік апартуністычнай бязьдзейнасьці загатоўцаў.

ЛІПАЎКА ЯН.

Не адгружана ні аднаго цэнтнэра

БАРЫСАЎ, 3. (БЕЛТА). ТЭМПЫ ЗАГАТОВАК І АДГРУЗКІ БУЛЬБЫ ЛЕНІНГРАДУ ПА БАРЫСАЎСКІМ РАЁНЕ ЗУСІМ НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧЫЯ І СТВАРАЮЦЬ РЭАЛЬНУЮ ПАГРОЗУ ЗРЫВУ ЗАДАНЬНЯ З 824 ТОН БУЛЬБЫ, ВЫЗНАЧАНЫХ ПЛЯНАМ АДГРУЗКІ, НА СЁНЕШНІ ДЗЕНЬ НЕ АДГРУЖАНА ЯШЧЭ НІ АДНАГО ЦЭНТНЭРА. РАЙЗАГ НАВАТ НЯ ВЕДАЕ, У ЯКІЯ АДРАСЫ АДГРУЖАЦЬ, БО ЯШЧЭ НЯ МАЕ АДПАВЕДНЫХ НАРАДАЎ.

Бульба псуецца з-за дрэннай пагрузкі

ЛЕПЕЛЬ.

АДГРУЗКА БУЛЬБЫ СА СТАНЦЫІ ЛЕПЕЛЬ ЗА АПОШНІ ЧАС ШЫРОКА РАЗГАРНУЛАСЯ. АДНАК, АБ ЯКАСЬЦІ АДГРУЗКІ НІХТО НЕ КЛАПОЦІЦЦА.

БУЛЬБА ПАГРУЖАЕЦЦА Ў ВАГОНЫ З ПАД ВУГАЛЮ, ЧАСТА ЗУСІМ МОКРАЯ. САЛОМАЙ ВАГОНЫ НЕ ПАДСЬЦІЛАЮЦЦА. У ВЫНІКУ БУЛЬБА ПРЫ ПЕРАВОЗЦЫ ПСУЕЦЦА.

А. НАЛЁТНЫ.

Навучальны год

Да 1 мая 1932 г. БССР павінна стаць КРАІНАЙ СУЦЭЛЬНАЙ ПІСЬМЕННАСЬЦІ

ДАБІЦЦА КРУТОГА ПЕРАЛОМУ

Цэнтральны камітэт КП(б)Б у ліпеньскай пастанове па дакладу Наркамасьветы аб падрыхтоўцы да навучальнага году паставіў як адну з баявых і адказных задач перад усімі партарганізацыямі і органамі Наркамасьветы: «Пераварзьнае БССР да 1 мая 1932 г. у краіну суцэльнай пісьменнасьці, ліквідаваўшы рэшткі няпісьменнасьці сярод рабочых і дапрызыўнікаў да 1 кастрычніка 1931 г.».

ЦК у гэтай-жа пастанове падкрэсьліў, што выкананьне гэтай вялізарнай задачы можа быць забясьпечана толькі пры ўмове разгортваньня шырокай падрыхтоўчай работы да новага навучальнага году і пры ўмове, калі ўся работа па разгортваньні культурнага будаўніцтва будзе праводзіцца базавымі, ударнымі тэмпамі, калі гэта работа партарганізацыямі будзе расцэньвацца як баявая, палітычная кампанія.

Мы вымушаны канстатаваць, што гэтая, дырэктыва ЦК радам партарганізацый і органамі Нарасьветы выконваецца нездавальняюча. Матар'ялы, якія мы сёньня друкуем, гавораць аб тым, што ў радзе буйнейшых гарадоў і прамысловых цэнтраў БССР яшчэ далёка не ліквідавана няпісьменнасьць, што на такіх заводах, як бабруйскі камбінат, віцебская фабрыка «Сьцяг індустрыялізацыі» няпісьменных рабочых налічваюцца дзесяткі і сотні.

Зусім нездавальняюча разгорнута сацыялістычнае спаборніцтва паміж гарадамі на пагалоўную ліквідацыю няпісьменнасьці да XIV гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі. ЦК КП(б)Б у якасьці прызу для гораду ці раёну, які першым дасягне ўсеагульнай пісьменнасьці, і лепшых паказальнікаў па культурным будаўніцтве, вызначыў гапаровы сьцяг ЦК КП(б)Б. Партарганізацыі і прафсаюзы зусім слаба разгортваюць змаганьне шырокіх пластоў пралетарскай грамадзкасьці за гапаровы сьцяг.

У радзе раёнаў забываюць аб тым, што канчаткова ліквідаваць няпісьменнасьць можна толькі пры ўдзеле самых шырокіх пластоў рабочай клясы, калгаснага сялянства, і ўсіх працоўных. Мабілізацыя асьветніцкіх сіл на фронт культурнага будаўніцтва праходзіць недапушчальна слаба. Больш як у 5 раёнах да гэтага часу яшчэ не распачаты заняткі на лікпунктах выключна з-за адсутнасьці кадраў настаўнікаў і культармейцаў.

Матар'ялы з месц сьведчаць аб тым, што наведваньне лікпунктаў і школ малапісьменнасьці зусім нязьвыстарчальнае. У паасобных раёнах лікпункты наведвае зусім нязначны процант рабочых і калгасьнікаў. Асобныя райвыканкомы, гарсаветы і сельсаветы літаральна ніякіх захадаў ня ўжываюць да выкананьня пастановы ЦВК аб прыцягненьні кожнага няпісьменнага ў лікпункт для таго, каб у абавязковым парадку ліквідаваць яго няпісьменнасьць.

Тое, што яшчэ да работы не прыступілі сотні лікпунктаў, тое, што наведваньне лікпунктаў і школ малапісьменных зусім слабое, гаворыць аб недапушчальна павольных тэмпах у рабоце раду райінспэктарыятаў нарасьветы, мясцкомаў саюзу асьветнікаў, прафсаюзаў і партыйных ячэек. Асноўная бяда заключаецца ў тым, што шмат якія партыйныя ячэйкі ня выконваюць пастановы ЦК УсеКП(б) аб штодзённай праверцы правядзеньня навучальнага году і разгортваньня культурнага будаўніцтва.

Значныя прарывы ў рабоце па ліквідацыі няпісьменнасьці тлумачацца і тым, што рад раённых газэт не разгарнулі баявой работы ў гэтым напрамку.

Для таго, каб да мая 1932 году ператварыць БССР у краіну суцэльнай пісьменнасьці, патрабуецца самаадданая работа ўсяго чырвонасьцяжнага настаўніцтва, усёй пралетарскай грамадзкасьці і паляшэньне кіраўніцтва партыйных камітэтаў і ячэек.

У бліжэйшыя дні павінен быць дасягнут круты пералом ва ўсёй рабоце лікпунктаў і школ малапісьменных. Барацьба за 100-процантнае наведваньне школ і лікпунктаў зьяўляецца барацьбой за пасьпяховае выкананьне задач культурнага будаўніцтва, за далучэньне да актыўнага ўдзелу ў гэтай рабоце новых дзесяткаў і соцень тысяч працоўных.

Распачаць заняткі

Па Менску ёсьць звыш 1.300 чалавек няпісьменных і каля 1.300 малапісьменных, для якіх адкрыта 226 лікпунктаў і 103 школы для малапісьменных. Да гэтага часу навучаньнем яшчэ не ахоплена 200 чалавек толькі рабочых, а лічба усіх неахопленых працоўных, дасягае 800 чал.

Гарадзкая інспэктура ня здолела мабілізавацца на поўны ахоп усіх няпісьменных з тым, каб да кастрычніцкіх сьвят Менск быў горадам суцэльнай пісьменнасьці. Прафсаюзы і камсамол слаба змагаюцца за стварэньне патрэбных кадраў. Прафсаюзы нічога не зрабілі ў справе матар'яльнай дапамогі Мэталком дрэнна наладзіў мэтадычнае кіраўніцтва.

Яшчэ горш стаіць справа па Менскім прыгаралным раёне. Нават інспэктура ня ведае, што там робіцца. Адсутнічаюць весткі аб ліку няпісьменных і ліку адкрытых школ лікбезу. Для ліквідацыі прарыву абвешчан дэкадзік штурму. У сельсаветы выехалі брыгады.

Слаба пастаўлена работа ў Чэрвеньскім раёне дзе ўсяго павінна быць ахоплена лікпунктамі 3.103 няпісьменных і 5.020 малапісьменных. На 20 верасьня ў лікпунктах навучаецца толькі 1.040 чалавек.

Па Чырвона-Слабодзкім раёне павінна быць адкрыта 45 лікпунктаў з ахопам 1.886 чалавек, але ўсяго адкрыта толькі 23, якімі ахоплена 390 чалавек. Школ малапісьменных павінна быць адкрыта 57 з ахопам 1.730 чалавек, адкрыта-ж толькі 20 школ. Школы лікбезу не забясьпечаны памяшканьнямі і падручнікамі. Таварыства «Проч няпісьменнасьць» у раёне разваліцца.

Прыведзеныя факты з усёй выразнасьцю гавораць аб пагрозе зрыву заняткаў у лікпунктах некаторых раёнаў. Гэта пагроза павінна быць адведзена.

К.

Школьная маемасьць разбазарана

БАБРУЙСК. Інстытут сацыяльнага перавыхаваньня да навучальнага году не падрыхтован. Да гэтага часу адсутнічаюць памяшканьні для заняткаў і майстэрні. Ня гледзячы на тое, што адміністрацыя інстытуту некалькі раз зьвярнулася ў гарсавет аб прадастаўленьні інстытуту адпаведных памяшканьняў, гарсавет на гэтыя просьбы не зьвярнуў увагі. Таксама не хапае настаўнікаў.

Невыстарчальнае забясьпячэньне вопраткай і абуткам дзяцей пагаршае ўмовы работы. Шмат школьнай маемасьці разбазарана.

Наркамасьветы павінна прыняць тэрміновыя меры і забясьпечыць усім неабходным бабруйскі інстытут сацыяльнага перавыхаваньня.

Н.

Ліквідацыі няпісьменнасьці— бальшавіцкія тэмпы

Партыйныя і ўрадавыя органы ў сваіх неадназначных пастановах паставілі рад складаных і важных задач перад усёй пралетарскай грамадзкасьцю, перад органамі савецкай улады, нізавымі парторганізацыямі і прафсаюзамі ў справе канчатковай ліквідацыі няпісьменнасьці. 1931-32 навучальны год павінен быць годам ліквідацыі рэштак няпісьменнасьці як сярод прамысловых рабочых, гарадзкога насельніцтва, так і ў сельскіх мясцовасьцях. На працягу гэтага навучальнага году тысячы і дзесяткі тысяч няпісьменных і малапісьменных працоўных павінны быць далучаны да актыўнага ўдзелу ва ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва.

Органы Наркамасьветы і некаторыя нізавыя парторганізацыі правялі параўнальна здавальняючую падрыхтоўчую работу да пачатку навучальнага году па ліквідацыі няпісьменнасьці. Лікпункты ў асноўным забясьпечаны падручнікамі, навучальнымі прыладамі, патрэбным абсталяваньнем. Па ўсёй Беларусі 1 верасьня быў праведзен «Дзень вучобы», у які ўсе лікпункты павінны былі пачаць работу па ліквідацыі няпісьменнасьці, але ў выніку простага ігнараваньня і недаацэнкі задач культурнага будаўніцтва ў паасобных раёнах пачатак заняткаў у лікпунктах сарваны.

Даволі паказаць, што ў МАГІЛЕЎСКІМ, КАСЬЦЮКОВІЦКІМ, ШКЛОЎСКІМ, ЗАСЛАЎСКІМ І СІРОЦІНСКІМ РАЁНАХ яшчэ ні ў адным лікпункце не пачаліся заняткі. Паводле вестак, атрыманых з 34 раёнаў, лікпункты наведваюцца ня больш, як 12-13 ПРОЦ. няпісьменных.

Прарыў у справе ліквідацыі няпісьменнасьці тлумачыцца зусім невыстарчальнай увагай з боку цэлага раду арганізацый да выкананьня дырэктыў партыі і ўраду аб канчатковай ліквідацыі няпісьменнасьці.

У Віцебску разгорнута шырокая работа па ператварэньні гораду ў горад суцэльнай пісьменнасьці да 14-ай гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі. Аднак, усё-ж мы прымушаны канстатаваць, што на паасобных вучастках і асабліва на прадпрыемствах Віцебску робіцца далёка не ўсё, каб да гадавіны Кастрычніка ліквідаваць няпісьменнасьць. На буйнейшай фабрыцы Віцебску — «СЬЦЯГ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ» — сыстэматычна зрываюцца заняткі выключна таму, што фабком ня лічыў патрэбным забясьпечыць школы малапісьменных і лікпункты адпаведнымі памяшканьнямі. Толькі па Віцебску можна падаць шмат прыкладаў, калі заводзкія грамадзкія арганізацыі і адміністрацыя ня толькі не дапамагаюць і ня кіруюць работай па ліквідацыі няпісьменнасьці, а тармозяць і зрываюць гэту работу.

Зарэгістраваны выпадкі, калі ня выконваецца 12-ты пункт пастановы СНК БССР ад 23-га мая 1931 году, дзе сказана:

«АБАВЯЗАЦЬ УСЕ ПРАДПРЫЕМСТВЫ, ДЗЯРЖАЎНЫЯ, КААПЭРАЦЫЙНЫЯ І ГРАМАДЗКІЯ ЎСТАНОВЫ І АРГАНІЗАЦЫІ ВЕСЬЦІ ЎЛІК НЯПІСЬМЕННЫХ, ЯКІЯ ПРАЦУЮЦЬ, ПАСТУПАЮЦЬ НА РАБОТУ І САЧЫЦЬ ЗА ЛІКВІДАЦЫЯЙ ІМІ СВАЁЙ НЯПІСЬМЕННАСЬЦІ І МАЛАПІСЬМЕННАСЬЦІ, УЖЫВАЮЧЫ ДА АСОБ, ЯКІЯ ЎХІЛЯЮЦЦА АД ГЭТАГА, МЕРЫ ВЫХАВАЎЧАЙ І АДМІНІСТРАЦЫЙНАЙ УЗЫДЗЕЙНАСЬЦІ».

На мясцох ня выконваецца пастанова ЦВК і СНК БССР аб прыцягненьні ў парадку грамадзкай работы да ліквідацыі няпісьменнасьці ўсіх пісьменных па ўзросьце ад 18 да 50 год, якія маюць адпаведныя веды.

Органы нарасьветы, партыйныя, прафсаюзныя і камсамольскія арганізацыі павінны неадкладна ўжыць усе захады да бальшога правядзеньня работы па ператварэньні буйнейшых гарадоў БССР у гарады суцэльнай пісьменнасьці.

Раёны да 14-ай гадавіны Кастрычніка павінны прыйсьці з буйнымі перамогамі на фронце культурнага будаўніцтва і ў прыватнасьці на фронце канчатковай ліквідацыі няпісьменнасьці.

АРЛОЎСКІ.

„НІ АДНАГО ЦЭНТНЭРА ЗБОЖЖА ПРЫВАТНІКУ“

МОЦНА УДАРЫЦЬ
па клясавай блізарукасьці барысаўскіх і вушацкіх загатоўцаў

Апэрацыйная зводка аб ходзе збожжазагатовак па БССР на 1 кастрычніка 1931 году.

НАЗВА РАЁНУ	Проц. выкаван. гадавога пляну
Аршанскі	38,6
Асьвейскі	36,0
Бабруйскі	36,3
Бешанковіцкі	16,2
Віцебскі	36,3
Вушацкі	8,4
Гарадоцкі	20,9
Горацкі	61,4
Гомельскі	110,7
Дрысенскі	—
Дубровенскі	39,3
Крупскі	16,6
Лёзьненскі	14,9
Лепельскі	21,9
Менскі	23,9
Магілёўскі	24,1
Мсьціслаўскі	16,8
Полацкі	33,1
Расонскі	36,0
Сеньненскі	6,9
Сіроцінскі	10,8
Сураскі	33,7
Талачынскі	36,0
Чавускі	18,9
Чашніцкі	13,3
Шклоўскі	42,3
Усяго па сыстэме Белкаапсаюзу	28,3
Асіповіцкі	6,2
Барысаўскі	20,0
Брагінскі	19,3
Буда-Кашалёўскі	29,7
Быхаўскі	84,5
Вягомльскі	8,2
Вялыніцкі	39,0
Варэйнскі	24,9
Веткаўскі	31,6
Гацускі	18,8
Жлобінскі	34,1
Жыткавіцкі	25,0
Заслаўскі	19,8
Камарынскі	16,3
Карманскі	24,6
Карэлінскі	14,7
Касьцюковіцкі	34,6
Клімавіцкі	30,0
Клічаўскі	3,6
Коўдапаўскі	13,5
Капыльскі	22,3
Чырвонапольскі	36,3
Крычаўскі	26,0
Лагойскі	28,3
Чельчыцкі	14,8
Лоеўскі	35,5
Любаньскі	10,9
Мазырскі	22,9
Нараўлянскі	40,4
Парыцкі	36,0
Плешчаніцкі	20,5
Прапойскі	17,5
Пухавіцкі	12,8
Пятрыкоўскі	6,5
Рагачоўскі	18,1
Рэчыцкі	19,7
Слуцкі	18,4
Смалявіцкі	24,5
Стара-Дарожскі	10,3
Старобінскі	29,0
Тураўскі	8,3
Уваравіцкі	47,5
Вузьдзенскі	21,9
Хойніцкі	36,6
Церахаўскі	37,0
Чачэрскі	15,7
Чырвона-Слабодзкі	20,4
Чэрвеньскі	8,2
Чэрыкаўскі	19,9
Усяго па сыстэме Белхлебжывсаюзу	23,0
Усяго на БССР	24,9

„Са збожжам яшчэ пасьпеем“

ВУШАЧЫ. (Наш кар.).

Вакол збожжазагатовак па Вушацкім раёне з самага пачатку ня была разгорнута масавая работа. Паасобныя парт'ячэйкі і сельсаветы, а таксама і праўленьні калгасаў правялі ў гэтым напрамку ноўную бязьдзейнасьць.

У выніку на 25-га верасьня гадавы плян збожжазагатовак выкаран толькі на 10,3 проц. Калгасы здалі 7,7 проц. свайго пляну, аднаасобныя гаспадаркі па самабавязацельствах — 5,9 проц. Кулацка-заможныя гаспадаркі па цьвёрдых заданьнях здалі 18,1 проц. пляну.

У радзе сельсаветаў адсутнічае націск на кулацка-заможныя гаспадаркі, якія злосна ня выконваюць даных ім цьвёрдых заданьняў.

Кулацка-заможныя гаспадаркі **Масырскага** сельсавету выканалі свой плян здачы збожжа ўсяго па 9,8 проц. Плінскі сельсавет таксама адносіцца прымірэнча да кулакоў, апошнія выканалі цьвёрдыя заданьні толькі на 4,5 проц. **Завячэльскі, Гарбаціцкі і Сарачынскі сельсаветы** ня ведаюць нават, якім гаспадаркам даны цьвёрдыя заданьні.

Раённыя арганізацыі таксама не мабілізаваліся на хутчэйшае выкананьне пляну збожжазагатовак. Старшыня райспажыўсаюзу т. **Нэйдлін** разважае так: **«Галоўнае, што нам трэба,—гэта з бульбай управіцца, а са збожжам яшчэ пасьпеем».**

Апартуністычныя спробы «стаўніць счарговасьць кампаній» не сустракаюць належнага адпору з боку кіруючых раённых арганізацый.

Райком КП(б)Б павінен прыняць рашучыя меры для неадкладнага ўзмацненьня загатовак. Трэба мабілізаваць пырокія масы калгасьнікаў, бедняцкоў і серадняцкоў — аднаасобнікаў на ажыцьцяўленьне канкрэтных задач барацьбы за кожнае кілё збожжа.

Ліпаўка Ян.



Растуць домны.

Бязьдзейнасьць загатоўшчыкаў

БАРЫСАЎ.

Па **Веляцішкім, Карсакоўскім, Перасацкім, Зэмбінскім і Хайхопецкім** с.-с. дагатуль яшчэ не паступіла ні аднаго кілё збожжа па цьвёрдых заданьнях ад кулацка-заможных гаспадарак. Сваёй бязьдзейнасьцю гэтыя сельсаветы аб'ектыўна дапамагаюць клясаваму ворагу сарваць плян здачы збожжа.

У раёне не разгорнута масава-растлумачальная работа, ня ўжыты ніякія захады да своечасовага выкананьня пляну збожжазагатовак. Раённыя загатоўчыя арганізацыі бязьдзейнічаюць.

На 25 верасьня раён выканаў гадавы плян збожжазагатовак толькі на 15,4 проц. Па асобных сельсаветах процант выкананьня яшчэ **ніжэйшы. Бродаўскі і Лазінскі** сельсаветы выканалі пляны ўсяго на 3 проц., **Веляцішкі і Глівенскі** — на 1 проц., **а Парасоцкі і Забалеўскі яшчэ зусім не пачыналі загатовак.**

Б. Я.

ПЕРАДАВЫЯ СЕЛЬСАВЕТЫ—НА БУКСІР АДСТАЮЧЫХ!

ТАЛАЧЫН.

13 сельсаветаў Талачыншчыны дабіліся вялікіх посьпехаў у збожжазагатоўках. **АБОЛІЦКІ** сельсавет выканаў гадавы плян на 101 проц., **САКОЛІНСКІ**—на 86,5 проц., **ДРУЦКІ**—72,6 проц., **НЯХЛЮДАЎСКІ**—на 65 проц. і г. д.

Але значная частка сельсаветаў не падхапіла яшчэ закліку перадавых калгасаў і сельсаветаў і не мабілізавалася на своечасовае выкананьне пляну збожжазагатовак. Так, **СТАРАСЕЛЬСКІ** сельсавет выканаў гадавы плян толькі на 7,1 проц., **МАРХЛЕЎСКІ**—на 8,2 проц., **ТАЛАЧЫНСКІ**—на 11,7 проц., **НОВА-ПАЛЕЎСКІ**—на 12,1 проц.

Вельмі дрэнна стаіць справа са спагнаньнем збожжа з кулацка-заможных гаспадарак па цьвёрдых заданьнях. Некаторыя сельсаветы зусім бязьдзейнічаюць у гэтым напрамку. У **МАРХЛЕЎСКІМ, ТАЛАЧЫНСКІМ, НОВА-ПАЛЕЎСКІМ, КРУЧАНСКІМ І ПАЛЕСКІМ** сельсаветах ад кулацка-заможных гаспадарак па цьвёрдых заданьнях дагэтуль не паступіла **НІВОДНАГА ЦЭНТНЭРА ЗБОЖЖА. У выніку—па цьвёрдых заданьнях у сярэднім па раёне паступіла ўсяго 12,8 проц. пляну.**

РК КП(б)Б і райвыканком павінны зьвярнуць асаблівую ўвагу на адстаючыя сельсаветы, прымусіць іх разгарнуць высокія тэмпы загатовак. Перадавыя сельсаветы павінны ўзяць на буксір адстаючыя, дапамагчы ім у выкананьні пляну здачы збожжа.

Трэба бязьлітасна націснуць на кулацка-заможныя элементы, неадкладна спагнаць з іх усё збожжа па цьвёрдых заданьнях. Трэба рашуча ўдарыць па тых сельсаветах, якія патураюць кулацтву.

„Мы збожжа ня прымаем“

ДУБРОЎНА.

Гэтымі днямі калгасьнікі беднякі і сераднякі **Ціпевіцкага** сельсавету арганізавалі чырвоны абоз са збожжам. Калі апошні прыбыў у Дуброўну, райспажыўсаюз рашуча адмовіўся прыняць збожжа.

— Мы збожжа ня прымаем, вязеце ў Воршу, — заявілі работнікі райспажыўсаюзу.

Увесь дзень фурманкі здатчыкаў прастаялі дарэмна ў Дуброўне, патрабуючы ад спажыўсаюзу прыняцьця збожжа і нарэшце вярнуліся дамоў ня здаўшы яго.

Дубровенская РКК-РСІ павінна ўмяшацца ў гэту справу і прыцягнуць да суровай адказнасьці вінаватых у агідных зьдзеках са здатчыкаў збожжа.

ЧАРНЯЎСКІ.

ГАРОДНІНУ—ПРАЛЕТАРСКІМ ЦЭНТРАМ

РОЗНЫЯ РАЁНЫ—РОЗНЫЯ НАЦЭНКІ І ЦЭНЫ

СУРАСКІ РАЙКААПСАЮЗ АТРЫМЛІВАЕ КАМІСІЙНЫХ 6 ПРОЦ., РАГАЧОЎСКІ—12 ПРОЦ. У МЕНСКУ ГАРОДНІНА ПЕРШАГА І ТРЭЦЯГА ГАТУНКУ ПРАДАЕЦЦА ПА АДНОЛЬКАВАЙ ЦАНЕ

НАРКАМСНАБ БССР ПАВІНЕН ВЫПРАВІЦЬ УСЕ СКАЖЭНЬНІ У ГЭТАЙ СПРАВЕ І ЎЗМАЦНІЦЬ КАНТРОЛЬ ЭА ЦЭНАМІ У ЗАГАТОЎЧЫХ І КААПЭРАЦЫЙНЫХ АРГАНІЗАЦЫЯХ

У практыцы цэн на плодагародніну рынку БССР ёсьць шмат выпадкаў злоўжываньняў і блытаніны. Фармальна, як быццам, існуюць нацэнкі і цэны Наркамснабу, а фактычна цьвёрдых загатоўчых і прадажных цэн няма.

Вось найбольш яскравыя факты, выяўленыя ЦКК-НК РСІ. У адным выпадку **Сураскі** райкаапсаюз устанавіў кошт тары і пакаваньне аднаго кілёграму яблык у 6 з пал. кап. і за дастаўку 5 кап., а ў другім выпадку — 12 кап. і 6 кап. **Бабруйская** раённая загатоўчая кантора бярэ камісійныя за клг. памідораў у сваю карысьць і карысьць Белкаапсаюзу ў разьмеры 6 проц., а **Горацкая** кантора Белплодагародніны — 15 проц. **Сураскі** райкаапсаюз атрымлівае камісійныя за клг. яблык 6 проц., а **Рагачоўскі** райкаапсаюз — 12 проц.

Гэтыя факты сьведчаць аб тым, што па некаторых каапэрацыйных арганізацыях нацэнкі на плодагародніну ўстанаўліваюцца адвольна ў залежнасьці ад настроў кіраўнікоў гэтых арганізацый.

Ня мала агідных фактаў наглядаецца ў калькуляваньні цэн. **Віцебская** кантора Белплодагародніны адлічвае ў карысьць **адпраўшчыка** 12 з пал. кап. з кілёграму прадукцыі, якая накіроўваецца ў Ленінград, але з прычыны браку пакідаецца на месцы для рэалізацыі. Пры гэтым Белплодагародніна выходзіць ня з цэн Украіны, адкуль гародніна паступае і дзе яна каштуе таней, а з беларускіх цэн. Апрача таго, Віцебская кантора за гэту-ж прадукцыю бярэ ў сваю карысьць 20 проц. Гэты процант надавычай высокі і наогул спагнаецца няправільна, бо ён устаноўлен не з загатоўчай каштоўнасьці фруктаў, а з усёй сумы рахунку, уключаючы тарныя, накладныя і ўсякія іншыя выдаткі. Фактычна тут роля **Віцебскай** канторы Белплодагародніны зводзіцца толькі да выпіскі рахункаў. Такія нацэнкі супярэчаць дырэктыве сакратара ЦК УсеКП(б) тав. **Кагановіча**, які абавязаў Наркамснаб не дапускаць нацэнак на каштоўнасьць гародніны ў карысьць зьвяньняў гаспадарчых і загатоўчых арганізацый, што ня прымаюць непасрэднага ўдзелу ў перавозках, загатоўках і забесьпячэньні гародніной.

Такая-ж неразьбярыха існуе дзе-нідзе і ў **прадажных** цэнах. Мінская ЦРК адпускаюць плодагародніну па адной цане, а ЗРК — па другой. Яблыкі аднаго і таго-ж гатунку прадаюцца на 60 кап. за клгр. і па 25 кап. Становішча пагыбляецца злоўжываньнямі з боку некаторых загадчыкаў крамамі, якія штучна павышаюць цэны, або адпускаць плодагародніну ніжэйга гатунку па цэнах вышэйшых гатункаў. За такія злоўжываньні некаторыя работнікаў плодагародніх крам **Віцебску** ўжо зьняты з работы. Часта прадажныя цэны устанаўліваюцца «на вока». Скрынкі з фруктамі прысылаюцца ў крамы без накладных дакумантаў і адзінак. Ня ма паказаньняў аб цэнах у саміх скрынках. Саўгасы і калгасы, якія самастойна прадаюць гародніну і фрукты на рынках, таксама не прытрымліваюцца ўстаноўленых цэн. Наркамснаб Беларусі і яго органы на мясцох не кантролюць выкананьне дырэктыў аб нацэнках і цэнах на плодагародніну.

Наркамснабу і каапэрацыйным арганізацыям трэба бязадкладна ўрэгуляваць пытаньне аб нормах гандлёвых і накладных выдаткаў для гародніны і фруктаў. Для кожнага вьяна сыстэмы павінен быць дан цьвёрды процант нацэнак. Трэба ўрэгуляваць прадажныя цэны. Скажэньням у цэнах і нацэнках на плодагародніну рынку, якія б'юць па рабочым забесьпячэньні, трэба накласьці канец.

Л.

За 12 дзён загатовілі 675 кбм. дроў

Калектыў СНК БССР сваячасова адгукнуўся на заклік урадавых органаў аб ліквідацыі прарыву ў забесьпячэньні працоўных гор. Менску дрывамі.

На дровазагатоўкі была паслана брыгада ў складзе 21 асобы. Ня гледзячы на тое, што стаяла ўвесь час дрэннае надвор'е, брыгада за 12 дзён загатовіла 675,5 кбм. дроў, што складае 103,5 проц. да кантрольнага заданьня.

Брыгада правяла значную культурна-масавую работу сярод бядняцка-серадняцкага насельніцтва вёскі, у выніку чаго больш 2-х дзесяткаў гаспадарак уступіла ў калгас.

Брыгадзір.

Забясьпечыць захаваньне ўраджаю на зіму

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). ГЦРК павінен атрымаць 9.500 тон бульбы, з якіх 5.226 тон трэба будзе захаваць на зіму. Наяўныя склады забясьпечваюць захаваньне звыш 3-х тысяч тон, а астатнія 2 тысячы тон будуць зімаваць у капцох.

ЦРК засаліў 2 млн. буркоў, плян выканан поўнасьцю. Адчуваецца вялікі недахват у бочках для квашэньня капусты. ЦРК своячасова не паклапаціўся аб гэтым. Бандарныя майстэрні ня былі арганізаваны.

Б. Зэльманаў.

БАРАЦЬБА ЗА АПАЛ

Выканаць загад!

Пакласьці канец бязьдзейнасьці тых раёнаў, якія ня выконваюць дырэктыў партыі і ўраду аб забесьпячэньні Менску дровамі

Партыя і ўрад БССР далі загад Бабруйскаму, Глускаму, Асіпавіцкаму, Парыцкаму, Калінкавіцкаму, Пятрыкоўскаму, Жыткавіцкаму і Клімаўскаму леспрамгасам адгружаць Менску штодзенна 100 вагонаў дроў, а якіх 35 вагонаў, згодна дагавору МЦРК з Лесбелам, павінны паступаць у распараджэньне МЦРК спэцыяльна для снабжэньня найчыгункаў.

На сёньняшні дзень толькі Глускі раён выканаў заданьне партыі, а астатнія гапебна зрываюць выкананьне гэтай важнейшай дырэктывы.

У Менск паступае штодзенна ў сярэднім каля 50 вагонаў дроў, з якіх толькі 15 атрымлівае МЦРК.

У результаце верасьнёўская праграма, вызначаная ў 4.500 вагонаў, выканана ўсяго на 40 проц. Лесбел менш за ўсё піхавіцца такім нікуды ніякарым вынікам і склаў плян на першую дэкаду кастрычніка, дзе абавязаўся даставіць Менску 1.600 вагонаў. Але ізноў-такі Лесбел, наводле слоў яго работнікаў, не ўпэўнен у тым, што гэты абавязак, будзе выкананы.

Большасьць раёнаў тых леспрамгасаў, якія прымацаваны спэцыяльна для снабжэньня дровамі Менску, ня прынялі ніякіх мер да таго, каб шырока папулярызаваць усе тыя льготы, якія даюцца возчыкам і лесарубам. Возчыкі і па сёньняшні дзень ня ведаюць, што заробленыя ёмі ад вывазкі дроў не ўваходзяць у падатковае падаткаў.

Чыгунка, ад якой у значнай мэры залежыць бесьперабойнае снабжэньне гарадоў апалам, працуе кепска. Падача вагонаў-паражняку не забясьпечана.

З леспрамгасаў штодзенна паступаюць дзесяткі тэлеграм аб тым, што чыгунка не падае паражняку і адгрузка дроў не праводзіцца.

Шматлікія пастановы партыі і ўраду аб забесьпячэньні адгрузкі дроў вагонамі чыгункай ня выкананы.

Зусім дрэнна пастаўлена справа з разгрузкай вагонаў, якія прыбываюць з дровамі. У Менску вагоны прастойваюць цэлыя суткі. На ст. Асіпавічы 35 вагонаў дроў, прызначаных для адпраўкі ў Менск, былі загнаны ў тупік і прасталі там два дні. Другія 35 вагонаў стаялі ў тупіку з 29 верасьня да 7 гадзін раніцы 30 верасьня. І замест таго, каб адправіць у Менск усе 35 вагонаў, начальнік станцыі даў загад адправіць толькі 12. Астатнія 23 вагоны застаўся стаяць у тупіку.

Калі да начальніка станцыі зьявіліся брыгада рабочых, накіраваная менскім гарпрафсаветам, і спыталася ў яго —чаму-ж, нарэшце, будуць адпраўлены астатнія вагоны,—апошні адказаў ім.

— Прашу ўсіх ліквідаваць кабінэт. Мы і без вашага гарпрафсавету ведаем, што нам рабіць.

Усё гэта патрабуе бездакладнага выкананьня ўсіх тых указаньняў, якія даведзены вышэйшымі органамі і вызначаны ў спэцыяльнай пастанове менскага гаркому КП(б)Б аб мерапрыемствах па загатоўцы, вывазцы і адгрузцы дроў для Менску.

Найхутчэйшае ажыцьцяўленьне гэтай пастановы дасьць магчымасьць цалкам забясьпечыць Менск дровамі.

А. М-ў.

Здабыты торф ляжыць на палёх сьцілкі

Торфазаводы „Чырвоны сьцяг“ і „Смалявічы“ не разгарнулі падрыхтоўкі да новага сэзону

За сэзон 1931 году торфазавод «ЧЫРВОНЫ СЬЦЯГ» павінен быў даць 30.000 тон тарфянога апалу, а даў толькі 9.000 тон, што складае 27 проц. сэзоннага пляну.

Гэты глыбокі прарыў карэніцца ў тым, што кіраўніцтва торфазаводу працавала па-старынцы, спадзявалася на самацёк.

Абодвы торфазаводы Смалявіцкага раёну — «Чырвоны сьцяг» і «Смалявічы» — недадалі ў гэтым годзе краіне 32.000 тон торфу.

Для поўнага выкананьня вызначанай праграмы гэтыя заводы мелі ўсе аб'ектыўныя магчымасьці, але адсутнасьць патрэбнай колькасьці рабочай сілы, якую гаспадарчае і прафэсыянальнае кіраўніцтвы торфазаводу на змаглі мабілізаваць (а мабілізаваных рабочых не замацавалі), не дало магчымасьці разгарнуць баявых тэмпаў і забясьпечыць выкананьне вызначанага ўрадам прамфінпляну.

Зараз, капі перад торфазаводамі стаіць адказьнейшая задача — цалкам убраць здабыты торф і забясьпечыць яго вывазку з палёў сьцілкі вод «Чырвоны сьцяг» забясьпечан — няма каму працаваць. Торфазарабочай сілай толькі НА 6,3 ПРОЦ.

Высушана ўсяго 30 проц. здабычы. Да вываздкі фактычна ня прыступлена. Белторф не ставіць перад сабой задачы разгарнуць будаўніцтва чыгункі для таго, каб здабыты торф своячасова можна было вывозіць менскай электрастанцыі, якая зьяўляецца асноўным спажыўцом торфу, што здабываецца на торфазаводах Смалявіцкага раёну.

Падрыхтоўка да будучага сэзону не разгорнута. А між тым, праграма торфаздабычы абодвум заводам значна павялічана.

Заводзкія арганізацыі не разгарнулі належнай падрыхтоўчай работы да новага сэзону. Белторф пакуль што ня вызначыў поўных лімітаў для таго, каб разгарнуць новае будаўніцтва бараках і падрыхтаваць своячасова балоты пад здабычу торфу.

Зусім дрэнна стаіць справа з дастаўкай посматар'ялу. Жодзінскі вучпесгас ня выконвае сваіх заданьняў па забесьпячэньні заводаў круглым лесам.

Смалявіцкі райкамбінат таксама ігнаруе будаўніцтва торфазаводаў, адмаўляецца адпусьціць патрэбную колькасьць цэглы і іншых матар'ялаў.

Патрэбна безадкладнае ўмяшаньне органаў РСІ. Нельга ні ў якім разе дапусьціць зрыву падрыхтоўчай работы да новага сэзону, які мае адказьнейшае значэньне для смалявіцкіх торфазаводаў.

ПРАФІЛЯКТЫКА—АСНОВА БАРАЦЬБЫ З ЭПІЗООТЫЯМІ

САЎГАСНЫ І КАЛГАСНЫ АКТЫЎ— НА ДАПАМОГУ ВЭТЭРЫНАРЫІ

Наркамзем сумесна з супроцьэпізоатычным трэстам усесаюзнага Наркамзему «ВЭТ» праводзіць масавую барацьбу з заразьлівымі хваробамі сьвіней па саўгасах і калгасах БССР. У мэтах прыпыненьня нашырэньня заразьлівых хвароб робяцца прышчэпкі супроць найбольш заразьлівых хвароб.

На працяту красавіка-чэрвеня былі зроблены прышчэпкі супроць чырвонкі (рожы) сьвіней, а зараз праводзяцца прышчэпкі супроць небясьпечнай для сьвіней хваробы—чумы.

Гэта хвароба дае найбольшыя страты ў нашай гаспадарцы, а таму, каб правесьці гэта мерапрыемства найлепшым спосабам, неабходна грамадзкая дапамога калгаснага і саўгаснага актыву.

Справа ў тым, што пры правядзеньні прышчэпак супроць чумы, якія дзейнічаюць на доўгі час (ня менш 1 году), вэтработнікі ўводзяць у цела сьвіньні разам з сываяткай і невялікую колькасьць заразы (чумнага вірусу), сьвіньня перахворвае ў лёгкай форме, пасьля чаго яна ня ўспрымае гэтай хваробы.

Таму ў часе правядзеньня гэтых прышчэпак неабходна стварыць для сьвіней больш спрыяючыя ўмовы ўтрыманьня, кармленьня і догляду, бо адсутнасьць гэтых вэтэрынарна-гігіенічных запатрабаваньняў можа прывесьці да таго, што сьвіньні пачнуць перахворваць ня ў лёгкай, а ў цяжкой форме, што можа выклікаць упадак жывёлы.

Стварэньне неабходных для правядзеньня актыўных прышчэпак умоў цалкам залежыць ад кіраўнікоў саўгасаў, праўленьняў калгасаў, сьвінагадоўчых фэрм.

Гэтыя запатрабаваньні наступныя:

Забясьпечыць сьвіней гігіенічным памяшканьнем, не дапускаючы скучанасьці, сачыць за чыстатой падлогі, частай зьменай сухога чыстага подсьцілу, прадугледзець неабходную вэнтыляцыю памяшканьняў, каб у памяшканьні ўвесь час было сьвежае паветра, каб у яго прасякала сонечнае сьвятло, без якога ні адна жывёла ня можа жыць і пры наяўнасьці якога ўсе ўзбуджальнікі заразьлівых хвароб вельмі хутка зьнікаюць.

Забясьпечыць жывёлу выгулам, гэта значыць адвесьці неабходную плошчу зімой, калі сьвінарніка, абнесьці яе агароджай і ў добрае надвор'е выпушчаць туды сьвіней.

Сачыць за чыстатой скуры сьвіней. Гэтага можна дасягнуць чыстатой у памяшканьнях і мыцьцём сьвіней.

Сачыць за правільным кармленьнем сьвіней, даючы ім цалкам добраякасны корм, не забываючы пра тое, каб у кармовую норму ўваходзіла належная колькасьць бялкоў, вуглявода, тлушчаў, мінэральных соляй, і забясьпечыць добраякаснай вадой.

Выкарыстаць будаўнічы сэзон гэтага году з тым, каб пабудаваць, каб крыстасаваць памяшканьне для ізалятара, куды вымяшчаць усіх захваровых сьвіней.

Каб у далейшым забясьпечыць сваю гаспадарку ад заносу ў не заразьлівых хвароб, трэба прыняць за правіла не дапушчаць у гаспадарку ўсіх паступаючых сьвіней без таго, каб яны ня былі ня менш як з тыдні ў карантыне —у асобным памяшканьні з асобным ад здаровых сьвіней дагледжаючым пэрсаналам.

Прыняць за правіла—крупы ўсіх загінуўшых сьвіней, як і іншай жывёлы, абавязкова закопваць на скотных могілках, а не на полі, або ў лесе.

Выкананьнем гэтых мінімальных вэтэрынарна-гігіенічных мерапрыемстваў мы дасягнем таго, што прышчэпка, якая забясьпечвае супроць чумы, пройдзе бяз усякіх ускладненьняў, што ў далейшым дасьць значнае памяншэньне заразьлівых хвароб сярод сьвіней.

Гэта ёсьць верны крок да вырашэньня мясной праблемы. Саўгасны і калгасны актыў павінен дапамагчы пры правядзеньні гэтых мерапрыемстваў.

Вэтдоктар ШАБЭКА.

ДЭЗЭРТЫРЫ

павінны атрымаць па заслугах

Барацьба з захворваньнямі жывёлы, асабліва сьвіней, затрудняецца недахватам вэтэрынарнага пэрсаналу. Асабліва востра адчуваецца недахват кваліфікаваных вэтэрынарных кадраў у калгасным сыстэме.

І вось зараз, калі Наркамзем і трэстам ВЭТ праводзіцца рад мерапрыемстваў па барацьбе з эпізоатыямі, некаторыя вэт. дактары ўсялякімі спосабамі імкнуцца ўхіліцца ад сваіх простых абавязкаў—ад дапамогі саўгасам і калгасам.

Гэтыя дэзэртыры з фронту барацьбы з эпізоатыямі заселі ў буйнейшых цэнтрах БССР і не жадаюць выязджаць у раён, ня гледзячы на неадназаовыя прапановы.

Так, вэт. доктар **Шмулевіч** увесь час сядзіць у гор. Віцебску і не жадае выехаць на работу ў раён. Вэт. доктар **Фрыдман** ужо даўно пакінула Юравіцкі раён і зараз знаходзіцца ў Віцебску, а на работу ў раён не выязджае. Вэт. доктар **Латышоў**, накіраваны Белкалгасцэнтрам у Чэрвеньскі раён, пейжім чынам трапіў у гор. Віцебск.

Сюды яшчэ можна дадаць і вэтдактароў **Сушкова, Ніфараева, Бялецька, Давыдава, Зарэніна, Шарпіла, Адэльбэрга, Азарова і Пушкарова.** Усе яны ўпарта ўхіляюцца ад работы ў саўгасах і калгасах і аканаліся ў найбольш буйных гарадох БССР.

Пралетарская грамадзкасьць павінна ўзьмацнейшаць на гэтых лятуноў і напомніць им аб абавязку, які яны нясуць перад дзяржавай. Трэба пастаўіць пытаньне аб тым, каб тыя вэтэрынарныя дактары, якія адмовяцца ад работы ў раёне, былі-б пазбаўлены сваіх дыплёмаў.

Г.

ПРАЦАВАЦЬ і КІРАВАЦЬ ПА-НОВАМУ

«...Усаветах закладзена вялізарная потанцыяльная сіла. Саветы і выканкомы маюць вялізарныя магчымасьці у арганізацыі ўздыму мас»
(з дакладу тав. КАГАНОВІЧА аб выніках сьнежаньскага пленуму ЦК і ЦКК на партактыве Маскоўскай арганізацыі).

Сьнежаньскі пленум ЦК і ЦКК УсеКП(б), а потым і VI зьезд Саветаў паставілі перад усімі саветамі СССР, як важнейшую задачу, перабудаваць усю сваю работу сваўрам да вытворчасьці, а тым, каб стаць сапраўднымі і добрымі кіраўнікамі ўсяго таго гаспадарчага і культурнага будаўніцтва, якое здыйсьнецца на тэрыторыі данага савету.

«Савет у цэлым, усе яго сэкцыі і кожны дэпутат паасобку адказваюць перад сялянамі выбаршчыкамі за кожны недахоп, выкуплены ў рабоце гарадзкой гаспадаркі. Выбіліна на бруку, недахват вады, каналізацыя дрэнна працуе, дрэнна пабудаваны дом, дрэнна працуе міліцыя, непаладкі ў школе, бруд у больніцы, непадкопы ў вулічным руху—за ўсё гэта адказвае савет». (Каганові).

Вось тыя задачы, якія былі пастаўлены перад саветамі вышэйшымі дырэктыўнымі органамі.

З таго часу Саветы СССР, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, дасягнулі рашаючых посьпехаў і ўжо значна перабудавалі сваю як масавую, гэтак і арганізацыйную работу прыстасоўна да новых трэцага рашаючага году пяцігодкі.

Асабліва значныя посьпехі дасягнуты ў тых адносінах у буйнейшых прамысловых цэнтрах СССР. Вопыт Харкаўскіх саветаў, дзе частка функцый апэратыўных аддзелаў ужо цалкам перададзена сэкцыям, быў падхоплен усімі саветамі УССР. Вельмі цікавым зьяўлецца вопыт ленінградзкіх раённых саветаў па ўзмацненьні ў практычную работу мас, выбаршчыкаў шляхам вярбоўкі актыву сэкцый на справаздачных сходах, вярбоўкі ударнікаў па савецкай рабоце і г. д.

Зусім новыя зьяўляцца формы масавай работы Баўманскага раённага савету г. Масквы, якія ўжо асьвятляліся ў «Звязьдзе».

У БССР таксама па радзе саветаў ідзе пўўная посьпехі ў галіне перабудовы і паладжваньня масавай работы. Асабліва ў гэтых адносінах трэба адзначыць Віцебск, які пры дапамозе Наркамзема ў складзе гарсавету арганізаваў масавага аддзелу дабіўся арганізацыі дэпутацкіх груп на ўсіх буйнейшых прадпрыемствах, арганізаваў пры масавым аддзеле інстытут добраахвотнікаў-інструктароў, арганізаваў конкурс на лепшую сэкцыю, разгарнуў паміж імі сацспаборніцтва і г. д. Але-ж, на жаль, трэба адзначыць, што ў БССР зусім не паладжаны абмен вопытам, і нават выданая ў 1931 г. Віцебскім гарсаветам кніжка «Аб перабудове масавай работы» дагэтуль зусім мала распаўсюджана і нават невядома Менскаму гарсавету і іншым.

Але-ж гэтыя паасобныя посьпехі ў некаторых саветах БССР ня могуць абвернуць тых аспоўных нівадаў, якія вышкаюць з матар'ялаў агляду, зроблены ў апошні час ЦКК-НК РСІ, ЦСПСВ і ЦВК БССР па радзе саветаў. А вынікі такія, што саветы БССР у сваёй пераважнай большасьці не перабудавалі дагэтуль сваіх форм і мэтадаў масавай работы, яшчэ вельмі мала зрабілі па ўцягненьні шырокіх пластоў працоўных у практычную дзейнасьць саветаў.

Па радзе саветаў масавая праца дагэтуль зусім не разгорнута, ці існуе толькі на паперы, прыкладам чаго можа служыць Полацкі гарсавет, дзе за 8 месяцаў работы былі тры спробы сабраць некаторыя сэкцыі і больш нічога ня зроблена.

Адным з істотнейшых недахопаў у рабоце сэкцый саветаў зьяўляецца тое, што яны яшчэ вельмі часта займаюцца пытаньнямі «навуці» «парадна», без кантэксту дзеяльнага зьместу, нават па самых актуальных пытаньнях. Так, напрыклад, прамысловая сэкцыя Віцебскагарсавету заслухоўвала даклады аб выкананьні прамфінпляну адначасова на адным пасяджэньні па наступных 3-х буйнейшых прадпрыемствах горада: фабрыка «Дзьвіна», фанерны завод і акулярная фабрыка. Між тым было-б значна карысьней, калі-б сэкцыя зацікавілася асобным канкрэтным пытаньнем на тай ці іншай фабрыцы і вырашыла-б яго да канца (скарыстаньне сыраду, зьдзельчыва і г. д.). Зразумела, што па такіх «агульных» дакладах сэкцыя магла вынесьці толькі ўмо-ж «агульную» пастанову. Так, па дакладу фабрыкі «Дзьвіна» вынесена пастанова:

1. Канстатаваць, што прамфінплян ня выкаран.
2. Прасіць гарком заслухаць даклад дырэктара і парткалектыву.
3. Даручыць брыгадзе выпрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы па ліквідацыі прарыву.

Узьнікае пытаньне, каму якая карысьць ад пастановы гэтага пытаньня на сэкцыі.

Альбо вось яшчэ прыклад: сельск.-гас. сэкцыя заслухоўвае даклад аб падрыхтоўцы да вясеньняй сяўбы і выносіць пастанову: «Прасіць гарсавет прыняць тэрміновыя меры да забесьпячэньня прыгарадных гаспадарак кармом, насеньнем, жылым памяшканьнем і аб высяленьні жыхароў. Апрача таго, ЦРК мець большы нагляд за дзейнасьцю гаспадарак». Таксама ўзьнікае пытаньне да каго зварачваецца сэкцыя, калі гарсавет—гэта яна сама, і калі ёй даручана вырашыць гэтае пытаньне канчаткова і паказаць, куды высяліць жыхароў, якім чынам забясьпечыць насельнем і г. д.

Зразумела, што і тут ніякай карысьці ад пастановкі пытаньня няма.

Таксама, як прыклад, можна прывесьці, што ў Менскім гарсавеце прамысловая сэкцыя намецела адначасова абсьледаваньне выкананьня прамфінпляну па 22 прадпрыемствах. Зразумела, што з гэтага нічога ня выйшла. Камунальная сэкцыя заслухоўвае агульны даклад аб становішчы жылбудаўніцтва, па якім выносіцца рашэньне: «Прыняць да ведама».

Усе гэтыя жыцьця факты з практыкі работы сэкцый даюць права зрабіць вывад аб тым, што гарсаветы яшчэ не навучыліся напаўняць сваю штодзённую работу канкрэтным зьместам і не навучыліся накіроўваць энтузіязм і актыўнасьць працоўных на сапраўдную дапамогу і ўдзел у рабоце сав. апарату.

«Ад саветаў зараз патрабуецца што-небудзь практычнае кіраўніцтва, не «навуці», не «парэтра», а канкрэтна-прадмэтнае з падыходам да кожнага пытаньня ня з пункту погляду агульных разважаньняў, а строга дзелавым, не абмяжоўваюцца папяровымі адпіскамі альбо агульнымі фразамі і лёзунгамі, а ўваходзіць у тэхніку справы, уникаць у дэталі, уникаць у дробязі, бо з «дробязяў» будуюцца зараз вялікія справы». (Сталін).

Другім аспоўным момантам, які тармозіць разьвіцьцё масавай работы зьяўляецца тое, што гарсаветы яшчэ не навучыліся ўвязваць работу сэкцый з апэратыўнай работай аддзелаў. Сэкцыі дагэтуль не зьяўляюцца сапраўднымі кіраўнікамі і арганізатарамі данай галіны гаспадаркі.

«Сэкцыі павінны ня толькі засядаць, выносіць пастановы, але-ж выконваць практычную апэрацыйную работу па кіраўніцтве дзяржавай» (Каганові).

Саветам БССР неабходна пайсьці па шляху скарыстаньня вопыту Баўманск

Год выданьня—XV
№ 272 (4177)
Аўторак, 6 кастрычніка 1931
Цана нумара 5 кап.
выходзіць
БЕСЬПЕРАПЫННА

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

РЭДАКЦЫЯ І КАНТОРА
МЕНСК, САВЕЦКАЯ, 65.
Тэлефоны
рэдактар—6-47,—сакратар—10-74, прадсяд. тар—13-60, прамысл.—13-80, сав. гасп.—6-19, мясц. інфарм.—6-19, замеж. інфарм.—6-19, начны рэдактар—6-42, міжгародняй інфармацыі—10-74, канторы: рахунк.—61, адд. абонемента—74-

Аўладаньне агранаміяй і агратэхнікай—
ключ да далейшых перамог
на фронце сацыялістычнага зямляробства

Асноўнае зараз—гэта вытворчае замацаваньне саўгасаў і калгасаў, барацьба за павышэньне ўраджаю

Зпрамовы народнага камісара зямляробства СССР тав. Якаўлева на пашыраным пасяджэньні калегіі НКЗ СССР

Барацьба за ўраджай становіцца галоўнай задачай саўгасаў, калгасаў і МТС. Мы вырашылі такую задачу, як стварэньне саўгасаў. У гэту вясну саўгасы засеялі больш 8 млн. гэкт. замест 3 млн. увесну 1930 г. Мы перанясілі ўсе папярэднія наметкі разьвіцця калгаснага руху, акрэсьленыя ў гістарычных пастановах ЦК партыі аб калектывізацыі. У верасьні 1931 г. у калгасах было аб'яднана 60 проц. бяднацкіх і серадняцкіх гаспадарак. У важнейшых раёнах, як збожжавых, так і сыр'ёвых калектывізацыя скончана.

На аснове саўгасаў, калгасаў і МТС, мы дасягнулі вялізарнай хуткасьці ў пашырэньні пасеўных плошчаў. У першы год масавай калектывізацыі 1927-28 г. было засеяна 120 млн. гэкт., у 1929-30 г. было засеяна 127 млн. і ў 1930-31 г. — 138 млн. гэкт., г. зн. рост пасеўных плошчаў на 7 млн., на 11 млн. гэкт. у год у той час, як за 10 год перад вайной пасеўная плошча Расіі вырасла да 15 млн. гэкт. Саўгасы, калгасы і МТС аказваюцца здольнымі ў год правесьці пашырэньне плошчаў, на якое царская Расіі патрабавалася 7 год.

Але ўраджаі ў нашых саўгасах і нашых калгасах зусім нездавальняючыя. Тэхніка нашых збожжасаўгасаў многа вышэй тэхнічнага ўзбраеньня калгасаў, а між тым, ураджаі ў збожжасаўгасах вышэй, чым ураджаі ў блізка ляжачых калгасах, пакуль што толькі на адзінкі процантаў. Гэта значыць — перавагі і выгады высокай тэхнікі дрэнна скарыстоўваюцца ў збожжасаўгасах. Тэхнічнае ўзбраеньне калгасаў многа вышэй тэхнічнага ўзбраеньня аднаасобнікаў. Між тым, ураджаі ў калгасах перавышаюць ураджаі аднаасобнікаў усяго толькі на 10-20 проц. Значыцца і тут перавагі аб'яднанай працы скарыстаны калгасамі ў першую чаргу для пашырэньня пасеўных плошчаў і ў вельмі малой ступені для падняцьця ўраджаю.

Саўгасы і калгасы не навучыліся яшчэ змагацца з ударамі, якія наносяць ураджаю засуха, сухавей, асеньнія дажджы і г. д. Трэба па-бальшавіцку прыняцца за вырашэньне задачы атрыманьня высокіх ураджаяў на аснове ўжываньня ў саўгасах усіх заваёў агранамічнай навукі. На першай стадыі арганізацыі збожжасаўгасаў пытаньне ўжываньня новай тэхнікі ў буйной гаспадарцы было галоўным і асноўным, але цяпер ўжо на аснове заваяваньня высокай тэхнікі трэба вырашыць другую задачу, задачу скарыстаньня заваёў агранамічнай навукі.

У збожжасаўгасах усіх важнейшых раёнаў нашай краіны зьдзяйляе, па-першае, дрэнная якасьць апрацоўкі зямлі, і па-другое, нагарджваецьць нават добрых работнікаў да агратэхнікі. У нас у саўгасах аказалася ня мала месц, якія уяўляюць з сябе да моманту пасеву стэп, якая бурна зарасла сарнякамі, пры тым стэп усю ў кочках і глыбокіх рытвінах. У нас ня мала аказалася зяб, якая прадстаўляе сабой палнятыя і неапрацаваныя пласты зямлі, нават не прадпаскаваныя. Між тым, трэба араць на кожным вучастку ў адпаведнасьці з яго асаблівасьцямі, у адпаведнасьці з культурай, якая на даным вучастку будзе араць на неабходную глыбіню. Пытаньне ідзе аб тым, каб засяваць тады і тое, што адпавядае асаблівасьцям умоў ня толькі саўгасу ў цэлым, але і паасобнага вучастку.

Нарэшце, агратэхніка заключае ў сябе і севазварот. Спэцыялізаваная збожжавая гаспадарка зусім не азначае, што севазварот зьніштчан нават у раёнах вытрыманай збожжавай гаспадаркі. Ад се севазвароту, як сродку паленшаньня структуры глебы мы **ніколі** не адмаўляліся. Бязглузьдзіца, што севазварот супярэчыць спэцыялізацыі. **Спэцыялізацыя гаспадаркі патрабуе адпаведнай зацікаўленасьці галоўнай культурай севазвароту, але зусім гэтага севазвароту не скасоўвае.** Таму і тут напладвацельскія адносіны да агратэхнікі **нелапушчальны для бальшавіка.** Сапраўдны гаспадарнік абавязан разумець, што пасьля вырашэньня задачы ўжываньня высокай тэхнікі, неабходна перайсьці да вырашэньня праблемы агранаміі.

Мы пакажам у асобе **МТС і саўгасаў, прыклад ня толькі таго, як на асновах новай тэхнікі бальшавікі будуюць буйную гаспадарку, але і прыклад таго, як на асновах буйной мэханізаванай гаспадаркі бальшавікі ўжываюць усе заваёвы сучаснай агранаміі ў сельскай гаспадарцы.**

Аналёгічнае становішча мы маем у калгасах. Некаторыя таварышы на мясцох да гэтага часу яшчэ думаюць, што галоўнай задачай у цяперашні момант зьяўляецца нагнаць лішні процант калектывізацыі. Два месяцы прайшло з таго часу, як Цэнтральны Камітэт партыі задачу ўмацаваньня калгасаў абвясьціў цэнтральнай і галоўнай. Між тым, да гэтага часу яшчэ многія раёны працягваюць «ганарыцца» новымі тысячамі калгаснікаў, рассылаюць аб гэтым доўгія рапарты Наркамзему СССР і Калгасцэнтру, думаючы, што ў гэтым цяпер галоўная задача. Кожная наша партыйная, савецкая і калгасная арганізацыя павінны зразумець, што цяпер, калі мы вырашылі задачу суцэльнай калектывізацыі ва ўсіх асноўных сельска-гаспадарчых раёнах нашай краіны, **барацьба за ўмацаваньне гаспадарак у калгасах зьяўляецца цэнтральнай, галоўнай,** той-жа, хто будзе галоўныя намаганьні накіроўваць на ўцягненьне ў калгасы аднаасобнікаў, гоняючыся за перапавялічанымі процантамі калектывізацыі, той пойдзе супроць указаньняў партыі, супроць лініі партыі ў цяперашні момант.

Мы навучыліся выкарыстоўваць перавагі калгасу для пашырэньня пасеўных плошчаў, але яшчэ не навучыліся выкарыстаць гэтыя перавагі ў справе павышэньня ўраджаяў. Для таго, каб напны масывы сапраўды сталі суцэльнымі, трэба зьніштчыць сьляды барбарскай гаспадарні аднаасобніка, трэба пераараць зямлю па-сапраўднаму, трэбаачысьціць яе ад дзесяткаў пакалесьняў сарнякоў, трэба прыступіць да ўвядзеньня севазвароту, трэба перавесьці зямлю з барбарскага стану ў культурны. Калгасная праца павінна абазначаць ня проста аб'яднаную працу, набудаваную на пачатках высокай машыннай тэхнікі, але і працу, набудаваную на пачатках прылажэньня навукі да сельска-гаспадарчай вытворчасьці, на пачатках ўжываньня агратэхнікі.

Зямельныя органы павінны перабудаваць сваю работу. Зямельныя органы адказваюць за стварэньне саўгасаў і за разгортваньне работы калгасаў на пашырэньні пасеўных плошчаў, яны павінны адказваць і за якасьць апрацоўкі зямлі. Пытаньне аб ролі навукі, аб ролі агранома, цяперашні ўдзел агранома ў справе падняцьця культуры нашых саўгасаў і калгасаў, у справе павышэньня ўраджайнасьці зусім невыстарчальны і неадпаведнаючы. Пасьля таго, як мы разгарнулі вялізарную сетку саўгасаў і аб'ядналі ў калгасах большасьць сялян у нашай краіне, перад намі адкрываюцца вялізарныя пэрспэктывы для ўжываньня накопленага агранамічнага вопыту.

Мы павінны ўкараніць ужываньне гэтага вопыту ў буйной гаспадарцы не на працягу 10-пігодзьдзя, а адзінак гадоў. Тут слова маюць аграномы. Вось чаму ў якасьці нам. дырэктара збожжасаўгасаў, жывёлагадоўчых саўгасаў і МТС мы цяпер назначаем агранома. Вось чаму ў прыватнасьці НКЗ СССР вызначыў нам. дырэктара Збожжасаўгасаб'яднаньня беспартыйнага агранома Худнева, які заслужыў сваёй папярэдняй работай у збожжасаўгасах ордэн Леніна.

Мы маем вялізарнейшыя перамогі ў галіне разьвіцьця саўгасаў. Мы ўжываем ў саўгасах новую тэхніку. Мы аб'ядналі большасьць сялян у калгасах, стварылі буйную гаспадарку ня толькі дзяржаўную, але і калектыўную, грамадзкую. На аснове саўгасаў і калгасаў наша краіна пайшла на шляху пашырэньня пасеўных плошчаў тэмпамі нябачанымі ў гісторыі сьвету. Цяпер мы павінны порайсьці да вырашэньня задачы вытворчага замацаваньня калгасаў і саўгасаў — задачы павышэньня ўраджаю. Адгэтуль лёзунг «Аўладаць тэхнікай» для работнікаў сацыялістычнага зямляробства будзе азначаць ня толькі лёзунг аўладаньня трактарам і камбайнам, але і лёзунг аўладаньня аграноміяй на падставе ўжываньня трактара і камбайна.

БАРАЦЬБА ЗА ЛЁН

Неадкладна
ўбраць з поля кожны сноп ільну і канапель

Убраць і рэалізаваць кожны цэнтнэр ільну

ДРЫСА. Саўгас Боркавічы засеяў у гэтым годзе 1200 гэктар. ільну. Цераблеьне скончана, але лён стаіць на полі ня зьвязаны і гніе. Кіраўніцтва саўгасу ня ўжывае рашучых мер, каб лён убраць з поля і апрацаваць. Ураджай ільну мінулага году таксама да гэтага часу ляжыць у саўгасе часткова пад адкрытым небам, нават не пасартаваны. Складатных памяшканьняў для ільну ўраджаю гэтага году няма.

Безгаспадарчасьць пануе і на другіх вучастках работы. Плянаў работы няма. Бываюць выпадкі, калі рабочых пасылаюць на тую работу, якая ўжо забясьпечана рабсілай. Вьдзельшчына ня ўведзена, сацспаборніцтва не разгорнута. Грамадзкае харчаваньне арганізавана дрэнна, у дастаўцы прадуктаў бываюць перабоі.

Трэба ўжыць неадкладныя меры для зьніштчэньня ўсіх гэтых ненармальнасьцей, патрэбна забясьпечыць скончаньне ўборкі і рэалізацыю ільну гэтага і мінулага году ў найкарацейшы час.

Лейкіна.

Уцягнуць у конкурс кожны калгас

СЕННА. Калгасы **«Гарадзец»** і **«Сьвечы»** ўключыліся ў конкурс на лепшую і хутчэйшую пераапрацоўку ільну.

Гэтыя калгасы першымі ў раёне пачалі здачу валакна і семя. Пераапрацоўка ільну і здача дзяржаве валакна і семя працягваецца.

Гэктары ільну ў карысьць друку ўбраць і апрацаваць сваячасова

МАГІЛЕЎ. Ударная брыгада селькораў-калгаснікаў калгасу **«Чырвоны сормавец»**, Сялецкага сельсавету, засеяла адзін гэктар ільну **ў карысьць нізавога друку.**

Лён быў дагледжан і праполат. І зараз у выходны дзень селькораўская брыгада гэты лён выцерабіла. Аднак, апрацоўка ільнасаломы затрымліваецца.

Задача селькораў па-ўдарнаму правесьці апрацоўку і здаць валакно дзяржаве ў бліжэйшы час. **У. Марскі.**

На пераапрацоўку ільну — пастаянныя брыгады

ТАЛОЧЫН. Хоць паасобныя калгасы Талочынскага раёну і пачалі здачу (продаж) дзяржаве ільну, усё-ж такі становішча з апрацоўкай ільну пагражаюча.

У Сакалінскім, Новапалескім, Кручанскім і Круглянскім сельсаветах ня скончана яшчэ церабленьне і апрацоўка ільнасаломы. Расьсьціл праведзен толькі на **12 проц.**

З боку памянёных сельсаветаў і раду старшынь калгасаў праяўляецца апартуністычная бязьдзейнасьць у адносінах да ўборкі і апрацоўкі ільну. Гэта ставіць пад удар ільназагатоўкі.

Калгасы **«Камбайн» ii «Энэргія»**, і некаторыя іншыя **арганізавалі пастаянныя брыгады па апрацоўцы ільну.** Гэта забясьпечыла пасьпяховае скончаньне ўборкі і разгортваньне пераапрацоўкі.

Брыгада «Зьвязды»:
Рожанец, Чаплінскі.

15 ільнаводчых калгасаў уключыліся ў конкурс

ВУШАЧЫ. Вушацкі раён уключыўся ў конкурс, абвешчаны НКЗВ. У раён для арганізацыі работы па пераапрацоўцы ільну паслана 22 таварышы з раённага партактыву.

У конкурс ужо ўключылася 15 буйнейшых ільнаводчых калгасаў.

ЛІПАЎКА Ян.

Убраць з поля канопліі і неадкладна апрацаваць

ЛІОБАНЬ. У саўгасе імя Х-годзьдзя БССР ёсьць рад буйных прарываў. Дагэтуль ня ўбрана з поля каля 800 ГЭКТАРАЎ КАНАПЕЛЬ, 30 гэктараў бульбы, 70 гэкт. капусты і інш.

Кіраўнікі саўгасу крыўдзяцца на недахват цягавай сілы, у той час, як у саўгасе наяўная цягавая сіла скарыстоўваецца нерацыянальна. На трактарох возяць зусім малыя вазы. У догледзе коняй панае абязьлічка. Збруя за коньмі не за мацавана, у выніку чаго амаль у кожнага каня пакапечаны храбты і грудзі. У саўгасе няма дакладнага ўліку жывёлы.

Пры саўгасе ёсьць партыйная і камсамольская ячэйкі, але яны пытаньнямі арганізацыі працы не займаюцца. Зьдзельшчына ня ўведзена, ударнікі не прэміюцца.

КАЛЮЧКА.

У чырвоным Гамбургу
баявая забастоўка маракоў

БЭРЛІН, 4. Паводле паведамленьня з Гамбургу, **у Гамбургскім порце бастуюць каманды 13 пэраходстваў.** Паліцыя, узначаленая сац.-дэмакратам Шэнфэльдэрам, арыштавала бастуючых качагараў параходу «Бохум» па абвінавачаньні ў мяцяжы. Судаўласьнікі спрабуюць сумесна з рэфармісцкімі прафбюракратамі замяніць бастуючых штрэйкбрэхэрамі. У порт сьцягнуты паліцэйскія пад мацаваньні. Палітычная паліцыя стварыла спэцыяльны аддзел для шпіёнства ва рэвалюцыйнымі партывымі рабочымі і маракамі.

Учора ўвечары паліцыя ў пошуках кіраўнікоў забастоўкі зрабіла **обыск у міжнародным клюбе маракоў.** Обыск ня даў рэзультатаў. Каб ухіліцца беспаседкаў, закрыта ў Гамбургу **біржа працы маракоў.** Як вядома, зарплата **маракоў** у Гамбургу згодна трацейскай пастановы скарочана на **13,5 проц.**, у той час, як правядзеньне скарачэньня зарплаты **партовым рабочым адтэрмінавана.** Гэтым прадпрыемцы імкнуцца парушыць адзіны фронт барацьбы маракоў і партовых рабочых. Рэвалюцыйны саюз маракоў заклікае партовых рабочых да агульнай забастоўкі супроць скарачэньня зарплаты.

Лепшая зброя супроць наступленьня капіталістаў—
адзіны фронт рабочых

БЭРЛІН, 4. Сёньня ў Бэрліне адбылася **канфэрэнцыя актывістаў рэвалюцыйнага прафсаюзу мэталістаў,** у якой удзельнічала звыш 500 дэлегатаў. Старшыня саюзу тав. Шольц указаў у сваім дакладзе на задачы, якія стаяць перад рэвалюцыйнымі мэталістамі Бэрліна ў сувязі з растаржэньнем прадпрыемцамі тарыфных дагавораў.

«Лепшай зброяй супроць наступленьня прадпрыемцаў,—заявіў тав. Шольц,—зьяўляецца стварэньне адзінага фронту рабочых мэталістаў на прадпрыемствах супроць прадпрыемцаў і сац.-фашысцкіх прафбюракратаў. Адзіным адказам мэталістаў прадпрыемцам павінна быць **усеагульная забастоўка.** У бліжэйшыя дні рэвалюцыйныя мэталісты павінны арганізаваць на ўсіх прадпрыемствах агульна-заводзкія сходы, на якіх сумесна з членамі рэфармісцкіх прафсаюзаў павінны быць распрацаваны канкрэтныя патрабаваньні рабочых.

Асноўныя патрабаваньні рэвалюцыйных мэталістаў наступныя: **44-гадзінны рабочы** тыдзень пры захаваньні поўнай зарплаты; **уключэньне беспрацоўных** у вытворчы працэс; адмена дзяржаўнага арбітражу; барацьба за права забастоўкі і супроць ураду Брюнінга. Рэвалюцыйныя мэталісты павінны змагацца за зарплату, якая існавала да кастрычніка 1930 г.».

Таварышы, якія выступалі ў спрэчках, пацьвердзілі неабходнасьць стварэньня адзінага фронту мэталістаў. Канфэрэнцыя прыняла адозву да ўсіх мэталістаў Бэрліна, у якой указвае ўсе арганізацыйныя мерапрыемствы для падрыхтоўкі да будучых баёў.

ЖЫВЁЛАЗАГАТОЎКІ

У найкарацейшы тэрмін
поўнасьцю выканаць плян жывёлазагатовак

Быхаўскі, Лельчыцкі, Касьцюковіцкі, Бярэзінскі, Прапойскі і Веткаўскі раёны павінны неадкладна падцягнуцца

Жывёлазагатоўкі — адна з важнейшых гаспадарча-палітычных кампаній, ад посьпеху якой залежыць у значнай частцы становішча рабочага забесьпячэньня.

Паводле дырэктывы партыі і ўраду, плян жывёлазагатовак па БССР павінен быў быць выканан поўнасьцю да 1-га кастрычніка. Аднак, недапушчальна слабыя тэмпы работы значнай часткі раённых мясазагатоўчых арганізацый прывялі да зрыву вызначанага тэрміну. НА 25 ВЕРАСЬНЯ ГАДАВЫ ПЛЯН ЗАГАТОВАК ВЫКАНАН НА 86,9 ПРОЦ.

За апошнія пяцідзеўкі тэмпы загатовак зусім невыстарчальныя. Так, за трэцюю пяцідзеўку верасьня было загатоўлена ўсяго 1,7 проц. гадавога пляну, за чацьвертую пяцідзеўку — 1,5 проц., за пятую пяцідзеўку — 1,1 проц.

Зьніжэньне тэмпаў жывёлазагатовак тлумачыцца галоўным чынам недаацэнкай гэтай кампаніі з боку некаторых раённых арганізацый. Замест таго, каб разгарнуць сапраўды ўдарную работу па АРГАНІЗАЦЫІ жывёлазагатовак, загатоўчыя органы ў радзе раёнаў спадзяюцца выключна на самацёк.

У выніку ў гэтых раёнах процант выкананьня гадавога пляну зусім нездавальняючы. Так, БЫХАЎСКІ раён выканаў 50 проц. гадавога пляну, ЛЕЛЬЧЫЦКІ — 53,8 проц., КАСЬЦЮКОВІЦКІ — 58,6 проц., БЯРЭЗІНСКІ — 60,9 проц., ПРАПОЙСКІ — 61,9 проц., ВЕТКАЎСКІ — 67 проц.

Між тым, частка раёнаў, якая разгарнула бальшавіцкія тэмпы работы, дабілася бліскучых посьпехаў на жывёлазагатоўчым фронце. КАПЫЛЬСКІ раён выканаў сваё гадавое заданьне на 169,9 проц., ЧЫРВОНАСЛАБОДЗКІ на 186,1 проц., ЛАГОЙСКІ на 167,4 проц., АСЬВЕЙСКІ на 140 проц., ВУЗЬДЗЕНСКІ на 124 проц. і г. д.

Вопыт гэтых раёнаў паказвае, што плян жывёлазагатовак зусім рэальны і можа быць пасьпяхова і сваячасова выканан. Для гэтага патрэбна толькі бальшавіцкая ўпартасьць у змаганьні за высокія тэмпы загатовак.

Купацтва і яго агентура вядуць шалёную агітацыю супроць здачы жывёлы дзяржаве. Між тым, некаторыя раёны ня процістаяць кулацкай агітацыі шырокую масава-растлумачальную работу сярод калгаснікаў і аднаасобнікаў, не арганізуюць іх на рашучую барацьбу з кулацтвам.

Цьвёрдыя заданьні кулацка-заможнымі гаспадаркамі да гэтага часу яшчэ поўнасьцю ня выкананы. Трэба неадкладна спагнаць з кулакоў цьвёрдыя заданьні, прыцягнуць да суровай адказнасьці кулакоў—злосных сабатажнікаў жывёлазагатовак.

У бліжайшыя дні плян жывёлазагатовак павінен быць ва што-б там ні стала поўнасьцю выканан. Мясазагатоўчыя арганізацыі абавязаны неадкладна ўзмацніць тэмпы жывёлазагатовак. Трэба раўняцца па перадавых раёнах, якія паказваюць лепшы ўзор барацьбы за вырашэньне мясной праблемы.

Блюдзіцкі сельсавет патурае кулакам

УВАРАВІЧЫ. (Наш кар.).

На 25-е верасьня плян загатовак жывёлы па Уваравіцкім раёне выканан на 87,5 проц.

У некаторых сельсаветах, як напрыклад **Ліпскім, Блюдніцкім, Уваравіцкім, Цярэніцкім, Целяшоўскім** і інш. заданьне па загатоўках ня выкапана нават на палову.

Такае становішча тлумачыцца выключна нядбайнымі адносінамі да гэтай справы як загатоўчых арганізацый, так і сельсаветаў, ёсьць выпадкі калі члены сельсаветаў замест дапамогі ў правядзеньні загатовак, дапамагаюць разбазарваць жывёлу. Напрыклад, сакратар Ліпскага сельсавету Юркаў вызваліў свайго бацьку ад здачы каровы. У гэтым-жа сельсавеце зьніштчана вялікая колькасць маладняку.

У **Блюдзіцкім** сельсавеце няма націску на кулацка-заможныя элементы. Жывёла ўтойваецца. Кулакі, якія маюць па 4 штукі буйной рагатай жывёлы, заданьняў не атрымалі, а ў гэты самы час сельсавет, дае цьвёрдыя заданьні... беднякам. За скрыўленьне клясавай лініі, Блюдзецкі сельсавет прыцягваецца раённымі арганізацыямі да судовай адказнасьці.

Уваравіцкія райарганізацыі павінны рашуча ўзяцца за выкананьне пляну загатоўкі жывёлы. Трэба моцна ўдарыць па апартуністых, якія зрываюць гэту важнейшую кампанію.

А. КАЗІМІРАЎ.

Адкорму жывёлы—максымум увагі!

СНК СССР і ЦК УсеКП(б) у сваім зваароце аб разьвіцьці мясной і кансэрвовай прамысловасьці завастрылі ўвагу ўсіх арганізацый на неабходнасьці ўмацненьня адкормачнай справы.

Забесьпячэньне рабочага васьвіцтва мясам лепшага гатунку патрабуе, каб праз зімовы адкорм прапускалася як мага больш жывёлы.

У асноўным адкорм жывёлы базуецца на адкідах прамысловасьці і прадуктаў земляробства. У нас для адкорму скарыстоўваецца брага—адкіды броварнай прамысловасьці.

Поўным выкарыстоўваньнем брагі на браварох, пры адначасовым скармліваньні грубым кормам сена і саломы і прыняязначным ужываньні моцных кармоў мы можам атрымаць значную прыбаўку мясе.

Нажаль, жывёлазагатоўчыя арганізацыі, якія павінны былі-б быць асабліва зацікаўленымі найлепшай пастаноўкай адкорму, не аддаюць гэтай справе належнай увагі.

У гэтым годзе ў пяршыню адкорм буйной рагатай жывёлы ўскладзен на сыстэму Белдзяржсьпірту пры браварох. Для сыстэмы Белдзяржсьпірту гэта справа зьяўляецца зусім новай. Трэба адзначыць, што адкорм жывёлы—надзвычай складаная работа, якая патрабуе да сябе пільнай увагі і падтрымкі ня з боку грамадзкасьці і зацікаўленых арганізацый.

Згодна дагавору паміж Белдзяржсьпіртам і Белмясам, апошняе павінна было выканаць плян пастаўкі жывёлы для адкорму не пазьней і кастрычніка. Аднак **на сёньняшні дзень пастаўлена на адкорм усяго 46 проц. пляну.**

Гэта стварае рэальную пагрозу зрыву **адкормачнага пляну.** Акрамя таго, з-за **нядбайнасьці загатоўчых органаў** на адкормачныя пункты **трапляе шмат жывёлы,** зусім **непрыгоднай** для гэтай мэты. Перадаўшы валоўні Белдзяржсьпірту, Белмяса зусім забылася аб подрыхтоўцы жывёлы да адкорму і да апошняга часу роўна нічога не зрабіла ў гэтым напрамку.

З забесьпячэньнем адкормачных пунктаў канцэнтраванымі кармамі справа абстаіць ня зусім добра. Выданыя Саюзкормам нарады на завоз гэтых кармоў, з-за межаў БССР да гэтага часу ня выкананы і бровары на сёньня ня маюць ні аднаго кілёграма канцэнтраванага корму. Гэта становішча пагражае зрывам адкорму. Тут неабходны рашучыя меры. Між тым ні НКЗ, ні каапэрацыі, ні Наркамснаб не адаюць гэтай справе належнай увагі.

Будаўніцтва валовень зрываецца з-за адсутнасьці матар'ялаў. Паводле плану павінна быць пабудавана 7 новых валовень, кожная на 100 галоў. Да гэтага часу для гэтага будаўніцтва ўдалося дабіцца нарадаў толькі на лес, дый тое на франкалес. Зразумела, што сіламі і сродкамі заводаў высычы і вывезьці гэты лес у месячны тэрмін немагчыма. **Таму да пабудовы валовень дагэтуль яшчэ ня прыступлена.** Не забясьпечана будаўніцтва і цьвікамі, жалезам і іншымі матар'яламі.

Шкодна адбіваюцца на правядзеньні адкорму і некаторыя «дробязі», як напрыклад, недахват дробнага інвэнтару і ў прыватнасьці ланцутоў. Жывёла на 100 галоў заганяецца ў адну валоўню, дзе яе няма чым прывязаць. У выніку могуць быць выпадкі калецтва жывёлы, нармальна даглядаць жывёлу няма магчымасьці. Ня гледзячы на ўсе настойваньні перад Белснабам аб забесьпячэньні адкормачных пунктаў ланцугамі, або настромкамі, Белдзяржсьпірт нічога не дабіўся і да гэтага часу.

Спэцвопраткай адкормачныя пункты таксама не забясьпечаны; адсутнасьць спэцвопратки стварае цякучасьць рабочай сілы на валоўнях, што вельмі адбіваецца на ходзе адкорму.

Неабходна зараз-жа павярнуцца тварам да арганізацыі адкорму. Ведамства, павінна перабудаваць сваю работу і ўсёй рашучасьцю дамагацца выкананьня пляну адкорму як колькасна, так і якасна.

Перад Наркамснабам ставіцца адзін раз пытаньне аб пераглядзе адпускных цэн на сена і салому, устаноўленых Саюзпрамкормам. Так, загатоўчая цана на салому—1 р. 90 к. за цэнтнер, а бровар плаціць яму за гэты-ж цэнтнер 4 р. 35 кап.

Гэта пытаньне трэба зараз-жа ўзняць і «камэрцыйныя апэтыты» Саюзпрамкорму зьменшыць, бо яны вельмі дорага абыходзяцца рабочаму спажыўцу.

Наркамснабу таксама трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу на сваячасовае і бесперабойнае забесьпячэньне будматар'ялямі новага будаўніцтва.

П. Д.

„Вольны" грамадзянін і пан паліцыянт
(ЛІСТ З ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ)

Шырокія рабоча-сялянскія масы—вось чый пот і чыя кроў пакрывае рахунак параліжаванага крызісам польскага капіталу і крывэжэрныя апэтыты польскай вяншчыны.

Капітал вядзе наступленьне на жыцьцёвы ўзровень мас. У адказ на гэта выступленьне ўзьнімаецца магутны фронт рабочых і сялян, пад кіраўніцтвам кампартыі. Лёзунг—«ні гроша падаткаў фашысцкаму ўраду»—набывае з кожным днём усё большую і большую папулярнасьць і пачынае быць баявой праграмай дзеяньня рэвалюцыйных мас.

Мы нядаўна атрымалі ліст з Заходняй Беларусі. З прычыны надзвычайнай характэрнасьці ліста, мы падаем яго цалкам і бяз зьмен. Гэты ліст, напісаны непасрэдна селянінам,—найлепшая ілюстрацыя таго становішча, у якім апынулася ў цяперашні момант заходня-беларуская вёска і тых настрояў, якія бурляць у шырокіх масах працоўнага сялянства. Вось гэты ліст:

«Учора яшчэ быў я **пад замком,** сёньня-ж—«на волі». Учора быў палітвязьнем, сёньня—я **«вольны»** грамадзянін польскай рэспублікі. Учора яшчэ прыносілі 400 грам хлебнага цеста з прэлай мукі, сёньня-ж—трэба самому шукаць чаго-небудзь зьесьці, калі ня хочаш галодным здыхаць.

Шукаць трэба ня толькі для сябе, але і для сям'і.

«Няма хлеба»—з такім прывітаньнем спаткала мяне сям'я пасьля 4-гадовай катаргі яшчэ на парозе ня дому, ня хаты, а буды. Гэта памяшканьне на 6 асоб.

Вяска. У вясковай беднаты ні зярняці. Двары крапівою пазарасталі. Хлеб—па полі і ў кулака. У яго поўна. Ці не пазычыць, бо купіць няма за што? Працаваць няма дзе—беспрацоўе і ў вёску заглянула. Ідуць. Пытаю купіць. Ведае, што кішэню маю пустую, прапануе «даць». Умовы такія: адпрацаваць за тры пуды жыта—два дні пакасіць і тры дні памалаціць. На рынку хлеб—3 злотых.

— «І гэта яшчэ добра,—адказвае кулак.—Ты змучаны, працаваць ня можаш, а есьці трэба даць».

За чатыры гады сямейка прыдбала коніка. Еду ў млын малоць пазычанае жыта. Выяжджаю з вёскі. Па дарозе ўздоўж і ўпоперак круціцца на вэлёсыпэдзе пастаўнік польскай начатковай школы. Ня езьдзіць, а дзяжурыць. Ён—шпік. Не даяжджаючы, перад самым маім конікам паўмысна ўпаў.

Конік малады, неабежджаны, хоць галодны, але шустры—раптам кінуўся ў бок. Адна хвіліна—і я пад возам. Конь сьцягнуў воз з дарогі, рассыпаў хлеб—«падарунак» «дабрадзея»—кулака—растрос усё па полі і выскачыў-шы з аглобляў, паляцеў.

Пастаўнік шалее ад злосьці. Поруч з ім, як з-пад зямлі вырас паліцыянт. Распытвае, як я наехаў на яго.

Пасьля, ня пытаючы мяне, піша пратакол. Не адзін, а чатыры. Па-першае, за тое, што я не з правага боку ехаў, па-другое, за тое, што конь ня быў закілзаны, па-трэцяе, таму, што каля дуті няма «дакумантаў» і пачацьвёртае—за натурбаваньне пастаўніка. На мае тлумачэньні паліцыянт нават не зьвярнуў увагі. Але на гэтым бяда ня скончылася. Паліцыянт пашоў на мой двор і напісаў яшчэ некалькі пратаколаў. Вось яны:

за тое, што комін ня белы—адзін, няма вядра каля калодзежа—другі, басака і пажарнае мятлы не заўважыў—трэці, пачуўшы голас паліцыянта, сабака з піскам уцёк з двара—чацьвёрты, карова, прашоўшы двор, не ўшанавала паліцэйскага гонару і накідала памёту—пяты, на хаце няма нумару (дошчачкі з прозьвішчам гаспадара).—шосты, адхожае месца не зьлвілася перад панам—сёмы. Разам—адзінаццаць. За кожны з гэтых пратаколаў з мяне сьцягнуць тры і пяць злотых. І гэта, браточкі, толькі за адзін дзень. А такіх дзён вельмі многа ў году.

Можна было-б яшчэ прывесьці цэлы рад такіх прыкладаў, але ўсіх не пералічыш. Аб падатках рознага віду, якія проста душаць нас—і гутаркі няма.

Калі-б падлічыць усё гэта, дык выходзіць, што толькі і працуеш, каб кары, штрафы і падаткі аплачваць, **«дабрадзею»** кулаку адрабляць, а **сам крапівою вечка жывеш,** часта і бяз солі.

Надыходзіць восень, пачынае сьпець збожжа ў полі. Але пачынае таксама заглядаць у вёскі і сэквэстратар. Не пасьпееш зжаць,—прыедуць, апішуць і забяруць апошняе зерня за кары, штрафы і падаткі. Да гэтага дадаць яшчэ доўг кулаку—і ў сябе нічога не застанецца. Нават пасеяць ня будзе чым.

А што будзе наступнай вясной—і думаць страшна.

Але сяляне ўжо навучыліся змагацца. На панскія экспэдыцыі па апошнія фунты нашага збожжа мы адкажам: «Ні гроша ўраду голаду і вайны».

Сялян нашай Заходняй Беларусі вызваліць з-пад гэтага ярма толькі рэвалюцыя. А гэтага мы і чакаем. І ня толькі чакаем, але рыхтуемся. Акупан там на Заходняй Беларусі будзе скора цесна.

СЕЛЯНІН З КОСАЎСКАГА ПАВЕТУ».

Кіно „КУЛЬТУРА"
ад 6 кастрычніка
новы савецкі фільм
вытворчасьці Межрабпомфільм
КАНЕЦ ДЗЕРАГІНА
звыш праграмы
ГОРДАСЬЦЬ ТРЭЦЯГА РАШАЮЧАГА
у 2-х частках.
Пачатак у 7 гадз., 8-45 і 10-30.

„ЧЫГ. ЗОРКА" Пач. 7; 8-45; 10-30 — Новы замежны фільм СЫН ЗОРА у 8 ч. у гал. ролі Дуглас Фэрбэнкс
Інтэрнацыянал Адкрыт з 12 г. дня — Мастацкі фільм ЛЕДЗЯНЫ ЛЁС Звыш. прагр. хроніка
ПРАЛЕТАРЫ Адкр. з 12 г. дня — Мастацкі фільм ГАРАДЫ І ГАДЫ Пачатак сэансу ў 2 гадз. дня.
„Юны Піянэр" (будынак кіно „Культура") — Мастацкі фільм ДЫЦЬКІ ХІТНЕ у 8 частках. Звыш праграмы—хроніка. Пач. у 1 г. Каса—з 11 г.
„СПАРТАК" Пач. 7, 9 і 11 г. Каса адкрыта з 5 г. — З 1-га кастрычніка—баявик РЭЙНСКІ БУНТАР драма ў 7 частках.

У саўгасе БРЫЛЁЎ адкрываецца
3-гадовая садова-гародняя школа саўгаснуча.
Прымаюцца ў школу рабочыя саўгасаў, калгасьнікі і дзеці рабочых і калгасьнікоў, скончыўшых 4 групы школы. Забесьпячэньне поўнае, за выключэньнем пасьцельных прылад.
Заявы накіроўваць да 15 кастрычніка па адрасе: Гомель, саўгас Ерыпоў.
Дырэктар саўгасу Ешчын.

6 кастрычніка, у 7 гадз. веч., у паталёга-анатамічнай аўдыторыі адбудзецца
СХОД навуковых і тэхнічных працаўнікоў мэд. інстытуту.
З прычыны важнасьці пытаньняў, яўка абавязк. ова.
Мясцком.

Плянава-статыстычны тэхнікум
ПАВЕДАМЛЯЕ,
што заняткі ў тэхнікуме пачнуцца з 15 кастрычніка г. г. толькі са студэнтамі, якія пражываюць у г. Менску і тымі, якія змогуць прыехаць і пражыць у Менску без інтэрнату на працягу аднаго месяца, да заканчэньня пабудовы інтэрнату. Астатнія т. т., якія зарлічаны студэнтамі тэхнікуму і якія часова (на працягу аднаго месяца) не змогуць пражыць без інтэрнату, не павінны зьяўляцца